Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтра[illegible] Камітэту Саветаў БССР

10 год выдан[illegible]

НОМЕР НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 47а. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял арыгінецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц . . . — 90 к. „ 2 „ . . . 2 р. 70 к. „ 6 „ . . . 4 р. — к. „ 1 год . . . 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовая . . . — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нашпаркі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок нашпаркі наперад тэксту 1 р. — к. За радок нашпаркі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьвяшчэнныя на 50 проц. даражэй. Зьвыш тарыфу бярэцца 10 проц. ашчэту.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант . . . 35 кап. За кожны дадатковы . . 15 „ Беспрадоўж. і чырэзпаўрмейныя за дакумант . . 15 „ За кожны дадатковы . . 5 „ Публікацыі ЗАГС'ту—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА у канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 181 (2670) Субота, 10-га жніўня 1929 г.

ПРА[illegible]ТАНЬНЕ УСЕБЕЛАРУСКАМУ ЗЬЛЁТУ ЮНЫХ ЛЕНІНЦАЎ!

ЗЬЛЁТ ПАВІНЕН ПАКЛАСЬЦІ ПАЧАТАК ВЯЛІКАМУ ПАХОДУ ЗА ДЗЯЦЕЙ, ЗА ПАДРЫХТОЎКУ НОВЫХ ЛЕНІНСКІХ КАДРАЎ.

ПІАНЭРЫ! БЯЗУПЫННА ІСЬЦІ ЎПЕРАД ПА ШЛЯХУ БАРАЦЬБЫ ЗА ЛЕПШУЮ БУДУЧЫНЮ ПРАЦОЎНЫХ, СТАЦЬ АКТЫЎНЫМІ УДЗЕЛЬНІКАМІ НОВАЙ КАМУНІСТЫЧНАЙ ГРАМАДЫ БУДЗЬЦЕ ГАТОВЫ!

БАРАЦЬБІТОМ ЗА ЛЕПШУЮ БУДУЧЫНЮ.

У разгары нябачанай у сьвеце вялізарнай творчай работы працоўных нашай краіны па будаўніцтву сацыялістычнай грамады, на фоне нарастаючых клясавых боек за ўплыў на падрастаючае пакаленьне—зьбіраюцца зьлёты лепшых сыноў рабочае клясы—юных ленінцаў.

У жыцьці дзіцячага камуністычнага руху—у жыцьці гэтай магутнай сілы—сілы будучыні, зьлёт вынялецца нябывалым сьвятам. У гэтыя дні ўся савецкая грамадзкасьць убачыць, якую зьмену сабе рыхтуе піянэрыя Беларусі. Дзіцячая невычарпаная сіла, дзіцячая бадзёрасьць і нястрымная энэргія накіравана па шляху творчых спраў. Юныя піянэры сталі дзейнымі сапраўднымі памоцнікамі дарослых. Апошні год даказаў, што піянэрарганізацыя сваім удзелам у трох буйнейшых кампаніях (перавыбары саветаў, паход за ўраджай і культ. паход) надзвычайна павысіла палітычную актыўнасьць піянэраў і грамадзка-палітычную ролю піянэрарганізацыі. Асаблівую каштоўнасьць мае тое, што піянэры ня толькі актыўна ўдзельнічалі ў розных галінах сацыялістычнага будаўніцтва, але і прыцягвалі да гэтага шырокія масы неарганізаваных дзяцей, апраўдваючы тым самым сваю ролю—кіраўніка і арганізатара шырокіх мас пралетарскай дзетвары.

Усебеларускі зьлёт пралетарскіх дзяцей, арганізаваных у піянэрскія атрады, павінен стаць ня толькі аглядам грамадзка-карысных спраў піянэрарганізацыі, ня толькі аглядам кадраў будучых рэвалюцыянэраў—якіх рыхтуе піянэрарганізацыя, а аглядам таго, **што зроблена партыяй, камсамолам, дзяржаўнымі органамі, прафсаюзамі ў падрыхтоўцы гэтых кадраў. Зьлёт павінен пакласьці пачатак вялікаму паходу за дзяцей, за падрыхтоўку кадраў.**

Бо будаваць камуністычнае грамадзтва могуць і павінны людзі вартыя гэтай вялікай задачы. А пагэтаму выхаваньне падрастаючых пакаленьняў працоўных клясаў павінна ісьці ў духу камунізму, у бязьлітаснай барацьбе за камунізм ня толькі на барыкадах, але на кожным вучастку мірнай будаўнічай работы, у барацьбе з усялякім рабствам і прыгнечаньнем, за сапраўдны калектывізм, за новага чалавека.

Выхаваньне дзяцей павінна стаць справаю ўсяе савецкае грамадзкасьці. У дапамогу піянэратрадам неабходна падняць шырока дабрахвотны рух рабочых, батракоў і беднякоў, а таксама культурна-тэхнічныя сілы, стваравочы в іх дружыны садзейнічаньня па выхаваньню піянэраў і дзяцей на вытворчасьці, установах і школах.

Пяцігодка мае шмат важных пунктаў, работа па якіх ня толькі падыме аўтарытэт атрадаў, але і дасьць вялікую карысьць краіне. Трэба толькі пералічыць такія вучасткі, як зьнішчэньне наёмнай дзіцячай працы да 14 год, радыёфікацыя рабочых і сялянскіх хат, ліквідацыя няпісьменнасьці, разьвіцьцё птушаводзтва і жывёлагадоўлі і г. д. **Канкрэтнае дзяржаўнае заданьне прышчапляць у піянэраў пачуцьцё адказнасьці за сваю работу. Патрэбна мабілізаваць спэцыялістаў, навуковыя і пэдагагічныя сілы і паставіць перад піянэрарганізацыяй цэлы шэраг канкрэтных дзяржаўных задач, сыстэматычна правяраючы іх выкананьне.**

Ад выхаваньня дзесяткаў тысяч дзяцей залежыць посьпех будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне. Рашэньне ЦК КП(б)Б па дзіцячаму камуністычнаму руху і рашэньні 3-га пленуму ЦК КСМ і 1-й усебеларускай канфэрэнцыі большасьцю партыйных і камсамольскіх арганізацый выконваецца да гэтага часу слаба, і самым лепшым падарункам піянэрам да іх зьлёту—будзе масавая праверка выкананьня гэтых рашэньняў. Патрэбна стварыць ўсе ўмовы неабходныя да выхоўваньня з піянэрарганізацыі баявога авангарду дзяцей працоўных.

„МЫ ЗАЎСЁДЫ ГАТОВЫ".

„На акруговым зьлёце піянэраў у Жытоміры паміж пасобнымі піянэрскімі дэлегацыямі падпісан дагавор аб спаборніцтве па правядзеньні асеньняй пасеўкампаніі. У дагаворы пішацца, што бацькі піянэраў, падпісаўшых дагавор, павінны першымі ачыньціць пасеўнае зярно". (З газэт).

Піянэры не перажылі гэраічных гадоў барацьбы. І яны сьпяшаюцца нагнаць страчанае... Стройнымі атрадамі, бадзёрымі сьпевамі і, нарэшце, на дзіва вытрыманай працай у шматлікіх і разнастайных майстэрнях, яны вясёла і нястомна гавораць аб сваім цудоўным існаваньні. Дзеці барацьбы, яны чула адносяцца да ўсяго, што вакол адбываецца. Піянэры ведаюць, хто прыяцелі і хто ворагі. У іх настойлівыя патрабаваньні: „Зьнімем з Кука піянэрскі галстух",—гучыць сапраўдная пралетарская незамірнасьць...

У іх барацьбе з буржуазнымі бойскаутамі жыве дух валяўнічай ленінскай партыі.

Хто не за нас—той проці нас. Менавіта ў гэтай клясавай выразнасьці, у гэтай стала палкай незамірнасьці, яснай і гнаровай хады зялёнай юнасьці—нутро нашай самай маладой зьмены...

— А чаму Гарсавет нам мала дапамагаў?

— А чаму прафсаюзы не садзейнічалі нашаму зьлёту?

— Больш увагі юнай ленінскай зьмене.

І моладасьць адзін за другім выбівае свае «патрабаваньні» і «пытаньні». Настойліва, шчыра, няўхільна...

Харкаў, Кіеў, Тыфліс і шмат іншых вялікіх і малых гарадоў ў гэтыя дні жывуць піянэрамі... Сьледам за акруговым зьлётам ідуць вабласныя і рэспубліканскія.

Уважліва слухалі піянэры Кіеўскай акругі прадстаўнікоў южна-афрыканскай і канадзкай кампартый. Праўдзівае, жудаснае апавяданьне аб катаржным жыцьці ў буржуазных краінах хвалюе піянэраў і заве іх да яшчэ большай гатоўнасьці хутчэй стаць у шэрагі байцоў за справу рабочае клясы ўсяго сьвету.

Піянэры Грузіі і Азэрбайджану ўзмоцнена рыхтаваліся да сваіх сьвятаў... З радасьцю спаткаючы сваіх старшых таварышоў, яны ў той-жа час узмоцнена ганьбяць працу кіруючых установаў. Гучнае „чаму" і «па якой прычыне»—больш пераконваючы ўсіх добрых прамоў.

Іх зьлёты—праверка піянэрруху. Мясцовыя зьлёты скончыць генэральны, Усесаюзны зьлёт, да якога так узмоцнена рыхтуюцца піянэрарганізацыі Саюзу.

На спэцыяльна арганізаванай выстаўцы ў час Усесаюзнага зьлёту будзе паказана ўсё, што датычыцца дасягненьняў піянэраў у розных галінах іх жыцьця, працы і грамадзкасьці.

„Праца і тэхніка", „Сельская гаспадарка", „Дзеці і Абарона СССР", „Братэрскія і варожыя арганізацыі" і г. д. і г. д.—вось асноўныя аддзелы гэтай выстаўкі.

Да жывога хвалюючага апавяданьня прыслухоўваецца ўвесь Саюз. Прыслухоўваецца з тым, каб рашуча сказаць: **„Піянэрства, на разьвіцьцё якога не зварачваецца дастаткова ўвагі і затрачваецца мала сродкаў, расьце яшчэ хутчэй і абяцае яшчэ больш, чым ужо даў камсамол. Не перажыўшы тых больш цяжкіх дзён і гадоў, якія перажыты большасьцю камсамольцаў, піянэры абяцаюць рабоча-сялянскай дзяржаве даць сотні і тысячы нэрвова і маральна здаровых, на дзіва таленавітых працаўнікоў".** (М. Горкі).

Крок за крокам заваёўвае сваё месца ў вялікай сацыялістычнай пабудове піянэррух. Ён расьце і робіцца больш сталым за лік увагі да яго савецкай грамадзкасьці, якая ўсё павялічваецца.

У процівагу буржуазным дзіцячым арганізацыям, нашы піянэры выхоўваюцца ў духу **міжнароднай пралетарскай салідарнасьці, у духу актыўнага ўдзелу ў будаўніцтве сацыялістычнай грамады.**

Толькі ў гэтым—увесь сэнс піянэрруху.

„Сіла і здароўе"—гэты лёзунг закрывае клясава-капіталістычную сутнасьць якіх-небудзь бой-скаутаў, у той час, як сапраўднае **выхаваньне моцных, фізычна і маральна здаровых барацьбітоў за справу рабочае клясы**—арганічна ўваходзіць у жыцьцё і быт нашых піянэраў.

На пытаньне савецкай краіны: „Ці гатовы?" — Усесаюзны зьлёт нашай янай, квітнеючай, баявой **зьмены—зьмен** гучна і ўпэўнена адказа:

— Мы заўсёды гатовы.

— Дзеля барацьбы.

— Дзеля пабудовы сацыялізму.

— Дзеля сусьветнага Кастрычніка.

Ян. БУЛАТАЎ.

У камітэце садзейнічаньня Ўсебеларускаму зьлёту.

На пазаўчарашнім пасяджэньні камітэту садзейнічаньня правядзеньню Ўсебеларускага зьлёту піянэраў была заслухана інфармацыя прадстаўніка штабу зьлёта аб пляне правядзеньня апошняга.

Даклад прынят да ведама і пастаноўлена зьвярнуцца ў Менскі Гарадзкі Савет з прапановай упрыгожыць горад на час піянэрскага зьлёту. Усім савецкім і грамадзкім арганізацыям Менску прапанавана ўпрыгожыць свае будынкі з надворку адпаведнымі лёзунгамі і інш.

Побач з гэтым гарсавету прапанавана даць загад аўтакіраўніцтву, каб кожны дэлегат зьлёту на прад'яўленьні дэлегацкага білету карыстаўся бясплатным праездам на аўтабусах.

Удзел прафэсыянальных саюзаў у піянэрскім зьлёце

Прадстаўнік штабу ўсебеларускага зьлёту піянэраў на пазаўчарашнім пасяджэньні прэзыдыуму ЦСПСБ выступіў з інфармацыяй аб падрыхтоўцы да зьлёту і аб пляне правядзеньня апошняга.

Заклік штабу да рабочых аб разьмяркаваньні па кватэрах маленькіх дэлегатаў сустрэў з боку рабочых мас самы гарачы водгук. К сучаснаму моманту мы маем такое становішча, калі жадаючых узяць да сябе прыяжджаючых піянэраў столькі, што кватэрамі яны будуць забясьпечаны досыць добра. Дахтары прынялі актыўны ўдзел у агляндзе тых кватэр, дзе выказалі жаданьне ўзяць піянэраў. Толькі нязначная частка не падыходзіць для разьмяшчаньня дзяцей па санітарна-гігіенічных умовах, або па цеснаце. Праводзілі агляд кватэр і камсамольцы. Паогул трэба сказаць, што кватэрнае пытаньне для ўдзельнікаў зьлёту стаіць здавальняюча.

Піянэры дэманструюць.

Адчыненьне ўсебеларускага зьлёту піянэраў адбудзецца сёньня ўвечары на Пляцу Волі, дзе будзе наладжан парад і мітынг.

11 жніўня адчыняецца ўсебеларуская выстаўка дзіцячых работ. На выстаўцы ў дыяграмах і плякатах будзе папулярызавацца сярод дзяцей 5-цігадовы плян разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры БССР. Трэба адзначыць, што вельмі горача адгукнуўся ВСНГБ, які прыняў самы актыўны ўдзел у арганізацыі выстаўкі па сваёй галіне.

Між тым Наркамасьветы, які, здавалася-б, павінен быць кроўна зацікаўлены ў арганізацыі такой выстаўкі, толькі ў апошнія дні заварушыўся. Ня ішоў пастустрэч штабу Наркамзем і некаторыя іншыя ўстановы.

У нядзелю 11 жніўня ад 1 да 2-й гадзіны дню маецца на ўвазе наладзіць працоўваць асобныя пытаньні. Дзеці ў сэкцыях будуць апрацоўваць піянэрскія наказы савецкай грамадзкасьці. У гэты-ж дзень увечары на спартыўнай пляцоўцы саду „Прафінтэрн" будуць наладжаны спаборніцтвы па розных гульнях паміж асобнымі групамі ўдзельнікаў усебеларускага зьлёту піянэраў, а таксама будзе арганізаван і вечар дзіцячай самадзейнасьці.

3 Віцебску на зьлёт прыяжджае дзіцячы шумавы аркестр, які, да слова сказаць, у Віцебску карыстаецца вялікім посьпехам. Аркестр гэты складаецца з 60 дзяцей.

13 жніўня ўдзельнікі ўсебеларускага зьлёту пойдуць у паход у чырвонаармейскія лягеры, дзе чырвонымі часьцямі будзе паказан дзецям паказальны бой. У лягерах дзеці наладзяць споборніцтва па стральбе і іншых відах спорту.

14 жніўня ў Менску піянэры наладжваюць карбоначны збор сродкаў на карысьць дзяцей працоўных капіталістычных краін. 15 жніўня—экскурсіі па прадпрыёмствах Менску і ўвечары зьлёт будзе зачынен. На зьлёце будзе абрана 210 дэлегатаў на ўсесаюзны зьлёт піянэраў.

Трэба падумаць аб тым, каб у час зьлёту Менск быў прыбраны па-сьвяточнаму, каб нашы маленькія дэлегаты адчувалі, што іх грамадзкасьць сустракае, як жаданых гасьцей.

На спаборніцтвы піянэраў уваход будзе вольны па членскіх прафсаюзных кніжках. штаб зьлёту выдаў 1500 экзэмпляраў календарнага пляну працы зьлёту, які будзе дасланы па ўсіх прадпрыёмствах і ўстановах.

На зьлёт з округ БССР прыедзе 560 дэлегатаў і 200 дэлегатаў будзе ад Менску. Напярэдадні зьлёту адбудзецца агульна-гарадзкая канфэрэнцыя неарганізаваных дзяцей, у якой прыме ўдзел 1500 дэлегатаў, галоўным чынам, дзяцей рабочых. Канфэрэнцыя абярэ дэлегатаў на ўсебеларускі зьлёт і нават 5 дэлегатаў неарганізаваных дзяцей паедуць дэлегатамі на ўсесаюзны піянэрскі зьлёт.

Прэзыдыум ЦСПСБ адзначыў, што з боку прафсаюзаў была зьвернута ўвага, як на папулярызацыю асноўных момантаў і задач піянэрскага зьлёту, так і наогул дзіцячага руху. Цэнтральным праўленьнем саюзаў запрапанавана выкарыстаць ход усебеларускага зьлёту для далейшага завастрэньня ўвагі прафсаюзных мас на пытаньнях дзіцячага руху.

Побач з гэтым ЦСПСБ даў дырэктывы, каб ЦП саюзаў арганізавала 10 жніўня ўдзел рабочых у піянэрскім парадзе. Для гэтай мэты кожнае прадпрыёмства павінна вылучыць па 25 рабочых. Старшыням ЦП саюзаў уменяна ў абавязак прысутнічаць на парадзе, адчыненьні канфэрэнцыі, вечары 3-х пакаленьняў, пры яе зачыненьні і наведваць працу канфэрэнцыі.

Цэнтральным праўленьнем саюзаў запрапанавана выканаць дырэктывы ЦСПСБ аб грамадзкай справаздачы ў друку ў галіне дапамогі прафсаюзаў піянэрпрацы.

Прафсаюзныя клюбы і сады павінны быць прыбраны адпаведнымі лёзунгамі і плякатамі. ЦП саюзаў павінны мабілізаваць свае аркестры музыкі і перадаць іх у распараджэньне штабу зьлёту. Белбюро ЦК саюзу чыгунпачнікаў запрапанавана абслужыць аркестрам сустрэчу і провады піянэрскіх арганізацый на станцыі чыгункі.

ЦП саюзаў сельска-гаспадарчых і лясных рабочых, а таксама Наркампрацы запрапанавана прыняць удзел у рабоце сэкцый па эканамічнай працы сярод дзяцей.

Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў **падносьці ўсебеларускаму зьлёту піянэраў ад імя ЦСПСБ сьцяг**, які будзе ўручан зьлёту на адчыненьні канфэрэнцыі. Выказана пажаданьне, каб кожнае ЦП саюзу вызначыла прызы для прэміраваньня ўдзельнікаў спартыўных спаборніцтваў.

Як падрыхтоўваліся ў Чэрвені.

Уся падрыхтоўчая праца распачалася за месяц да зьлёту. Мэтавай устаноўкай зьлёту было: узьняцьце палітычнай актыўнасьці дзяцей і накіраваньня яе па лініі выкананьня чарговых задач партыі ў галіне будаўніцтва, арганізацыя шырокай грамадзкай думкі навакол зьлёту і, наогул, камуністычнага руху дзяцей, прыцягненьне грамадзкасьці да ўдзелу ў працы зьлёту, дапамога ў працы піянэратрадаў, узмацненьня сярод іх інтэрнацыянальнага выхаваньня і г. д. Было абвешчана спаборніцтва на лепшы атрад па падрыхтоўцы да зьлёту. Падрыхтоўка да зьлёту вясковых атрадаў вылілася ў палепшаньні працы ў паходзе за ўраджай, зборы матар'ялаў на выстаўку, абгаварэньні арганізацыйных і мэтавых пытаньняў зьлёту і г. д. Гарадзкія атрады рыхтавалі мастацкую частку зьлёту: упарадкавалі экспанаты на выстаўцы, убралі піянэрскі клюб і г. д.

Практычная дапамога з боку большасьці ячэек ЛКСМБ адсутнічала. Матар'яльную дапамогу зьлёту далі РВК, прафсаюзы, горсавет і г. д. Саюз савгандльслужачых даў 20 рублёў, ў той час, як райзьлёт прасіў усяго 15 р., саюз друкароў пасьля заняткаў надрукаваў для кружачных зборaў жэтоны. Для збору сродкаў на карысьць дзяцей нямецкіх рэвалюцыянэраў профсаюзам быў прадстаўлены міжсаюзны сад для зьлёту, аркестр, клюбы і г. д. Дзеля правядзеньня зьлёту было сабрана 201 руб. грошай. Гэта сьведчыць аб тым, што грамадзкасьць зразумела і адгукнулася да такой важнай справы, як райзьлёт. Арганізацыі вёсак далі піянэрам-дэлегатам падводы. У падрыхтоўцы да зьлёту прымалі дзейны ўдзел і школы райёну. Штаб разьмясьціў усіх дзяцей з вёсак на кватэры гарадзкіх піянэраў; на гэтых кватэрах дэлегаты і сталаваліся. З вясковымі дэлегатамі наконт сталаваньня ня было праведзена ніякае гутаркі, у выніку чаго, дзеці адмовіліся харчавацца там, дзе іх прызначылі на кватэры, наворачы, што «нелк сорам-на». Дзецям пасьля гэтага даваліся абеды ў сталоўках г. Чэрвеня.

На зьлёт зьявілася 111 вясковых піянэраў-дэлегатаў. Пасьля ўрачыстага адчыненьня быў заслуханы даклад аб чарговых задачах камуністычнага руху дзяцей і аб самым зьлёце.

Вечарам дзецям была паказана кіно-фільма «Пат і Паташон у мыльне». Асабліва з вялікім зацікаўленьнем глядзелі дзеці карнавал «дружба працоўных усіх нацыянальнасьцяў. Карнавал рыхтавалі гарадзкія піянэры. На выстаўку вясковыя атрады вельмі мала прысылалі экспанатаў. Гарадзкія атрады мелі на выстаўцы мадэлі працы ў галіне тэхнікі, малюнкі, дыяграмы і пісьмовыя школьныя работы. Агляд выстаўкі прайшоў вельмі неарганізавана, без усякіх тлумачэньняў аб экспанатах. Зусім іншае ўражаньне зрабіла на дзяцей тое, што яны бачылі ў райённым краязнаўчым музэі, дзе пры агляндзе тых альбо іншых экспанатаў даваліся падрабязныя тлумачэньні.

Дзякуючы таму, што дзеці вельмі былі ўтомлены прыплывам новых вострых уражаньняў, спрэчкі па дакладу аб дзейнасьці вясковых атрадаў і райбюро ЮП праходзілі вяла. Выступіла ўсяго 13 дэлегатаў, апрача выступленьняў навадыроў. Але ўся канфэрэнцыя прайшла жвава. Яна паказала, што піянэры зразумелі задачы партыі і ўлады ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва краіны.

Пасьля канфэрэнцыі ўсе дэлегаты зьлёту разьбіліся на групы і пашлі на экскурсію ў друкарню, у Чырвоную армію, дзіцячы дом і электра-станцыю, дзе азнаёміліся з працаю гэтых прадпрыёмстваў і ўстаноў.

Трэба адзначыць, што выбары дэлегатаў на Усебеларускі зьлёт прайшлі вельмі ўдала. Дзеці мелі надзвычайна бадзёры настрой. Пры выбарах падавалі кандыдатаў рабочых і беднаты. Клясавая лінія была вытрымана, аб чым гаворыць гэткае выступленьне аднаго дэлагата: «Чарнавец—добры піанэр, паднасак, але я высоўваю кандыдатуру іншага таварыша, які нічога ня мае і сам служыць парабкам. А бацька Чарнаўца мае каня". Калі некаторыя гарадзкія піянэры хацелі замест кандыдатуры аднаго сына рабочага хацелі правясьці сына служачага дэлегата на Усебеларускі зьезд, дык сход цалкам адмовіўся ад гэтае прапановы.

Такім чынам трэці дзень зьлёту прайшоў жывей чым папярэднія дні, падняўшы настрой усіх дзяцей. У часе зьлёту сабрана на карысьць дзяцей Нямеччыны 48 руб. 89 кап. На зьлёце ўдзельнічала 988 чал. У гэтым ліку 595 школьнікаў неарганізаваных і 85 дзяцей неахопленых школаю не піянэраў. Як агульны вынік працы зьлёту трэба адзначыць, што падрыхтоўчая праца ў атрадах праведзена добра. Камсамольская арганізацыі ня быў дастаткова зацікаўлены зьлётам. Шырокая грамадзкасьць была прыцягнута да працы зьлёту, даўшы зьлёту матар'яльную дапамогу. Самы зьлёт быў вызначаны ня ў добры час, таму, што ў школах яшчэ былі заняткі (пачатак чэрвеня). На зьезьдзе адсутнічала арганізаванасьць і дысцыпліна. Выстаўка вельмі мала адбіла працу піянэратраду, асабліва вясковых. Зьлёт таксама паказаў, што атрадамі яшчэ добра не ўсвоены новыя мэтады працы.

Ня гледзячы ня ўсе недахопы і хібы, зьлёт узьняў палітычную актыўнасьць дзяцей і зацікавіў справаю камуністычнага выхаваньня нашых дзяцей шырокую грамадзкасьць.

К.

ПРЫЕЗД УДЗЕЛЬНІКАЎ ЗЬЛЁТУ.

Учора ў Менск пачалі зьязджацца ўдзельнікі Ўсебеларускага піянэрскага зьлёту. Прыехалі дэлегаты з Магілеўшчыны і іншых округ.

Сёньня прыяжджаюць усе іншыя дэлегаты зьлёту.

1-му УСЕБЕЛАРУСКАМУ ПІАНЭРЗЬЛЁТУ

Нашай зьмене, саратнікам камсамолу і партыі ў барацьбе за лепшую будучыню, сабраўшымся для абгаварэньня сваіх пытаньняў зьвязаных з далейшым вашым удзелам у сацыялістычным будаўніцтве, вам будаўнікам будучыні, ад комуністычнай партыі—шчырае бальшавіцкае прывітаньне.

Партыя мае надзею, што вы і надалей разам з камсамолам і партыяй—пад іх непасрэдным цьвёрдым кіраўніцтвам будзеце несьці сьцяг ленінізму ўперад.

Партыя жадае вам найлепшых посьпехаў у рабоце.

Няхай жыве І-шы усебеларускі зьлёт юных ленінцаў.

Няхай жыве сувязь трох пакаленьняў—партыі, комсамолу піанэраў.

Няхай жыве сталёвае кіраўніцтва кампартыі бальшавікоў.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГАМАРНІК.

* * *

Справа сацыялістычнага выхаваньня дзяцей ёсьць адна з важнейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва, бо гэта ёсьць справа выхаваньня новага чалавека для сацыялістычнай грамады. У вырашэньні гэтай задачы вялікую ролю адыгрывае і павінна адыгрываць „піанэрыя".

Праз „піанэрыю" камсамол і кампартыя ахопліваюць сваімі ўплывамі дзяцей і працуючых над іх камуністычным выхаваньнем.

Вось чаму трэба мабілізаваць увагу партыйных, прафэсыянальных, савецкіх і ўсіх іншых грамадзкіх арганізацый да першага ўсебеларускага зьлёту піянэраў.

Толькі пры сталай увазе і дапамозе з боку ўсёй савецкай грамадзкасьці зьлёт апраўдае сваё прызначэньне.

Наша гарачае прывітаньне працоўным дзецям Беларусі.

Наша рашучае патрабаваньне да бацькоў—больш увагі аддаваць справе выхаваньня дзяцей.

А. ЧАРВЯКОЎ.

* * *

Цэнтральны Савет Прафсаюзаў Беларусі шчыра вітае ўсебеларускі піанэрскі зьлёт.

Прафэсыянальныя саюзы ў сваёй рабоце дапамагалі і будуць далей дапамагаць камуністычнаму выхаваньню падрастаючай рабочай зьмены, новага пакаленьня будаўнікоў сацыялізму.

Няхай жыве 1-ы ўсебеларускі зьлёт піанэраў!

Няхай жывуць унучаты Ільіча!

Няхай жыве КП(б)Беларусі!

ПРЭЗЫДЫУМ ЦСПСБ.

НАШАЙ ЗЬМЕНЕ.

Нашай юнай зьмене, нашым малодшым братам і саратнікам у барацьбе—шчырае вагністае камсамольскае прывітаньне.

ЦК ЛКСМБ.



Неарганізаваныя дзеці пад піанэрскімі сьцягамі.

ВІТАЕМ АД ІМЯ НАСТАЎНІЦТВА.

Сёньня адчыняецца 1-ы ўсебеларускі зьлёт піанэраў. Усе працоўныя, а тым больш асьветнікі, галоўным чынам, настаўнікі ня могуць ня цікавіцца гэтым вялікай палітычнай важнасьці зьявішчам. Усе пытаньні, якія будуць вырашацца на зьлёце, зьяўляюцца і пытаньнямі працы настаўніцтва. Каму, як не настаўніку, выхавацелю новай камуністычнай зьмены, новых будаўнікоў сацыялізму і барацьбітоў-рэвалюцыянэраў, так блізкі патрэбы дзяцей; хто, як не настаўнік, культурны працаўнік павінен змагацца з адмоўнымі і хворымі бакамі дзіцячага жыцьця, з ненармальнымі адносінамі да дзяцей. Хто, як не настаўнік, будаўнік пралетарскай культуры, павінен перад усёй грамадзкасьцю паставіць пытаньне здаровых адносін да дзяцей і да іх выхаваньня.

Каму, як не настаўніку, цікавы дасягненьні ўсёй грамадзка-карыснай і вытворчай працы піанэрскіх атрадаў, школ і наогул усіх дзяцей.

Вось чаму настаўнік і цікавіцца піанэрскімі зьлётамі і тэй працай, якую праводзіць партыя і камсамол, бо настаўнік—першы памоцнік партыі і камсамолу ў яго працы па камуністычнаму выхаваньню дзяцей.

Вітаючы ад імя настаўніцтва першы зьлёт піанэраў, мы заклікаем усіх асьветнікаў аддаць максымум увагі справе выхаваньня дзяцей і прыцягваць да гэтай справы грамадзкасьць.

Няхай жыве згуртаваная праца партыі, камсамолу і настаўніцтва на выхаваньні новай зьмены!

Няхай жыве першы ўсебеларускі зьлёт піанэраў!

Камісія па садзейнічаньню Ўсебеларускаму піанэрзьлёту.

Пэдагогі і бацькі, на зьлёт!

З усіх канцоў Беларусі зьлятаюцца юныя піанэры ў Менск.

Сусьветная пэдагогіка да гэтага часу нічога падобнага ня бачыла, ня бачылі гэтага бацькі і грамадзкасьць.

Цяпер перад намі ўсімі, перад масай пастаўлены **калектыўны аб'ект дзіцяці**, а не асобны індывідум, і гэты аб'ект зьяўляецца не пасыўным для назіраньня за ім для кагось-та, а і сам вывучае сябе разам з тымі, хто цікавіцца ім, і вынікі гэтага вывучэньня павінны стаць вядомымі шырокім масам.

Калі перад намі стаіць вялікае, магутнае, калектыўнае дзіця, дык павінен быць і вялікі калектыўны пэдагог, і гэтыя два калектыўныя індывідумы павінны сумесна вырашаць тыя задачы, якія ставяцца перад намі сучаснасьцю аб дзецях, аб іх ролі ў пабудаваньні новага жыцьця.

Раз гэта так, дык неабходна з аднаго боку піанэрарганізацыі зрабіць шырокі заклік на зьлёт пэдагогаў і бацькоў, а з другога боку пэдагогі і бацькі сумесна в усёй грамадзкасьцю павінны прыняць актыўны ўдзел у зьлёце, каб гэта вялікае сьвята стала залогам стварэньня новага чалавека, новага быту, новых мэтадаў вывучэньня і выхаваньня дзяцей.

П. Г.

ПАРАД І МІТЫНГ УДЗЕЛЬНІКАЎ ЗЬЛЁТУ.

Сёньня а 6-й гадзіне ўвечары на Пляцу Волі адбудзецца парад - мітынг удзельнікаў 1-га Усебеларускага зьлёту піанэраў. Збор усіх удзельнікаў у садзе «Прафінтэрн» а 5 гадз.

Пасьля параду—мітынг, у „Доме Культуры"—кіно-мастаноўка.

ВЕЧАР 3-х ПАКАЛЕНЬНЯЎ.

Згодна рашэньню штабу—зьлёт піанэраў скончыцца вялікім вечарам 3-х пакаленьняў. У парадак дню вечару: прыём паказа дзяцей да грамадзкасьці, успаміны старых бальшавікоў аб подпольнай рабоце, прыём маніфэсту да дзяцей Беларусі і інш.

На вечары будуць абраны дэлегаты ў ліку 210 чал.—на ўсесаюзны зьлёт.

ЛЕНСКІ РАСТРЭЛ У РУМЫНІІ

У Румыніі ўчынена масавае забойства рабочых, якое перавышае па сваіх разьмерах усе масавыя забойствы бягучага году. У лагчыне рэчкі Жылавы, у Сяміградзьдзі па загаду ўраду нацыянальнай сялянскай партыі, прышоўшага да ўлады з дапамогаю сацыял-дэмакратыі, забіты 32 гарняка, а некалькі сот рабочых цяжка паранены. Гэтыя лічбы, прашоўшыя праз румынскую цэнзуру, мабыць няправільныя. Больш году назад гэтыя рабочыя пад кіраўніцтвам нацыянал-фараністаў (нацыянальная сялянская партыя) і рэфармісцкай прафбюракратыі дэманстравалі ў Альба Юліі. Яны арганізавалі дэманстрацыю супроць ураду лібэральнай партыі. Абурэньне гарнякоў Жылавы было пры дапамозе сацыял-дэмакратыі скарыстана нацыянал-фараністамі ў інтарэсах румынскай буржуазеі.

Прыход да ўлады ўраду Маніу не адразу расчараваў гарняцкія масы. Сацыял-дэмакраты, якія жульніцкім спосабам дабіліся пры дапамозе нацыянальнай сялянскай партыі 9 мандатаў у палаце дэпутатаў, старанна сеялі сярод гарнякоў Жылавы ілюзіі аб тым, што нацыянальная сялянская партыя зробіць у Румыніі дэмакратычны пераварот. Але вельмі хутка стала ясна, што новы ўрад ня толькі па сутнасьці, але і па форме працягвае палітыку ўраду Братыяну, і што ў лепшым выпадку ён імкнецца падвесьці масавую базу пад рэжым белага тэрору.

Ня гледзячы на дэмакратычныя ілюзіі рабочых мас, кампартыя і рэвалюцыйныя прафсаюзы заваявалі гарняцкія масы Жылавы. Рабочыя адступіліся ад сацыял-дэмакратыі і ад нацыянал-фараністкай партыі, яны павялі барацьбу за хлеб супроць магнатаў горнай прамысловасьці. Сацыял-дэмакратыя і амстэрдамскія прафсаюзы вельмі стараліся ўтрымаць рабочых ад якой-бы та ні было барацьбы за павялічэньне заработнай платы. А ў той-жа час нацыянал-фараністкі ўрад нагнаў у лагчыну Жылавы шмат войска, каб у выпадку патрэбы гвалтам прыдушыць забастовачны рух з самага пачатку.

Як мінуў тэрмін гэтага недарэчнага калектыўнага дагавору, утворанага амстэрдамскімі прафсаюзамі, рабочыя патрабавалі ўвядзеньня 8-гадзіннага рабочага дню замест 10-гадзіннага. Капіталісты адхілілі ўсякія перамовы з рабочымі, вынікам чаго зьявіліся крывавыя падзеі, аб якіх паведамлялі тэлеграмы, прашоўшыя, зразумела, праз румынскую цэнзуру. Крывавыя падзеі сьведчаць з аднаго боку, аб вялікіх посьпехах арганізацыі Румыніі пад кіраўніцтвам „партыі румынскай дэмакратыі“, нацыянальнай сялянскай партыі. Гэту партыю падтрымлівае ня толькі румынская сацыял-дэмакратыя, але і Другі Інтэрнацыянал у цэлым. Увесь Другі Інтэрнацыянал зьяўляецца рупарам ураду Маніў. Бязумоўна і зараз, пасьля жылаўскага растрэлу, стаўшага жывою косьцю вядомага ленскага растрэлу расейскіх рабочых царскімі апрычнікамі ў 1912 годзе. 2-гі Інтэрнацыянал, як і раней, будзе падтрымліваць і бараніць нацыянал-фараністкую партыю і румынскую сацыял-дэмакратыю.

Падзеі ў лагчыне Жылавы паказваюць, што стыхійны масавы рух рабочай клясы і бяднейшага сялянства прад'яляе вялікія патрабаваньні рэвалюцыйнаму авангарду румынскага пралетарыяту, загнанай у глыбокае падполье румынскай кампартыі. Румынская кампартыя пакладае ўсе сілы, каб справіцца з гэтай вялікай задачай. На чале румынскіх рабочых і сялян, на чале шырокіх працоўных мас зараз акупаваных румынскай буржуазеяй (Бэсарабія, Букавіна, Добруджа і г. д.) пры актыўнай дапамозе міжнароднага пралетарыяту яна разгорне рашучую рэвалюцыйную барацьбу супроць ураду Маніў і яго падручнікаў сацыял-дэмакратаў і здолее давесьці гэтую барацьбу да пераможнага канца.

«Правда».

Наскок на лягер юных піянэраў

НЬЮ-ЁРК, 7-8. Палітычная паліцыя міністэрства юстыі зрабіла наскок на лягер юных піянэраў у Сан-Бэрнардына. Паліцэйскія ўварваліся ў лягер уначы, паднялі 40 дзяцей з ложкаў, учынілі арышты і адабралі літаратуру.

У Нью-Ёрку прысуджаны да 6 месячнага зьняволеньня ў папраўчую калёнію для недарослых піянэр Гарры Эйсман, які ўдзельнічаў у дэманстрацыі супроць буржуазнай юнацкай арганізацыі бойскаутаў. На судзе паліцэйскія даказвалі, быццам Эйсман, рост якога каля 4 з паловай фут., ударыў нагой у бруха паліцэйскага каня, калі конная паліцыя ўрэзалася ў шэрагі дэманстрантаў.

Ангельскія піянэры на ўсесаюзны зьлёт.

ЛЕНІНГРАД, 8-8. Сёньня ўвечары а 9-й гадзіне на параходзе „Гамал“ прыехалі з Лёндану 9 ангельскіх піянэраў, якія прымуць удзел на ўсесаюзным піянэрскім зьлёце.

Урачыстае спатканьне ім наладзілі піянэры Васілеостраўскага райёну, якія арганізавалі зборныя атрады амаль з усіх заводзкіх прадпрыёмстваў райёну. Апроч таго іх сустракалі прадстаўнікі вобласных арганізацый моладзі. Ангельскія піанэры сёньня адяжджаюць у Маскву.

На кангрэсе інвалідаў.

ВАРШАВА, 8-8. Адбыўся 5-ты міжнародны кангрэс інвалідаў вайны. На кангрэсе прысутнічаў міністр працы Прыстар, прадстаўнікі Пілсудзкага, генэрал Рубтэрн і інш. Кангрэс ухваліў рэзалюцыю ў якой жадае посьпеху Гаагскай канфэрэнцыі.

На кангрэсе прымалі ўдзел і пятлюраўцы, скарыстаўшыя гэты выпадак для анты-савецкіх выступленьняў, іх падтрымала дэлегацыя польскага саюзу, на чале якога стаяць пілсудчыкі.

Дыплёматы занепакоены.

ЛЁНДАН, 9-8. Дыплёматычны карэспандэнт „Дэйлі Тэлеграф“ паведамляе, што ў замежных дыплёматычных колах вельмі непакояцца аб магчымым адмаўленьні Англіі ад капітуляцыі ў Эгіпце.

„Разбройваюцца“.

ПАРЫЖ, 7-8. У Сэнт-Эцьене пушчана на ваду падводная лодка „Абшэрон“, а ў Мюнтэрдэне контрмінаносец «Леф».

Урадовы крызіс.

ГЕЛЬСЫНГФОРС, 8-8. Прэзыдэнт прапанаваў дырэктару банка Каліё ўтварыць новы ўрад. Каліё абяцаў даць адказ у панядзелак.

Нячуваная навальніца.

ПАРЫЖ, 8-8. Як паведамляюць з Ліёну, у акрузе Іл-дэ-Франс навальніца нячуванай сілы зусім зьнішчыла пасевы ў 20 вобшчынах. Навальніца зрабіла шмат шкоды, страты вылічаюцца прыкладна ў 50 мільёнаў франкаў.

Клясавыя бойкі ў дні першага жніўня.

Барыкадныя бойкі ў Бараняве.

ПРАГА, 8. Дадатковыя весткі аб правядзеньні чырвонага дню ў Чэха-Славакіі паказваюць, што афіцыйная інфармацыя, якая кажа аб „поўным спакоі“—хлусьня. Самыя магутныя дэманстрацыі адбываліся ў Закарпацкай Украіне, у цэнтры якой—Ужгорадзе—усе фабрыкі спынілі працу а 4 гадзіне і перад фабрыкамі адбыліся шматлюдныя (па 5000 чал.) мітынгі. Пасьля іх разгону і арышту прамоўцаў, былі наладжаны дэманстрацыі, якіх паліцыі не магла разагнаць. Увечары адбылася 3-я па ліку вулічная дэманстрацыя.

Яшчэ лепш удаліся выступленьні ў Берасказе,—3-м па вялічыні гораду краіны. Напярэдадні чырвонага дню там адбыўся мітынг з удзелам паўтары тысячы рабочых, на якім выступаў камдэпутат Сагі. Потым была наладжана дэманстрацыя, а на другі дзень усе прадпрыёмствы баставалі. З раньня адбыліся дэманстрацыі і мітынгі, якія ня спыняліся ўвесь дзень. Толькі ўвечары, калі паліцыя атрымала падтрыманьне, быў учынены шэраг арыштаў.

У горадзе Баранява была сутычка паміж камуністамі і клерыкаламі, якія спраўлялі сваё царкоўнае сьвята і вялі сябе вельмі вызываюча. Падасьпеўшая паліцыя абараняла клерыкалаў і страляла ў камуністаў. Камуністы адказвалі рэвальвэрнымі стрэламі і пабудавалі барыкады.

ПАЛІЦЫЯ СТРАЛЯЛА Ў ЗЬНЯВОЛЕНЫХ.

ВАРШАВА. Польскія буржуазныя газэты падаюць падрабязнасьці аб непарадках, якія адбыліся 1 жніўня ў люблінскай турме, у якой знаходзяцца 417 крымінальнікаў і 117 палітычных. Яшчэ за некалькі дзён да 1-га жніўня зьняволеныя камуністы гучным абвяшчэньнем антываенных лёзунгаў і сьпевам рэвалюцыйных песьняў выказалі сваё спачуваньне надыходзячаму чырвонаму дню. Астрожная адміністрацыя захацела спыніць гэткія „злачынствы“. Пачаліся рэпрэсіі. Шэраг палітычных зьняволеных перавялі ў адзіночныя камэры, а некаторых пасадзілі разам з крымінальнікамі.

Гэтыя меры мелі неспадзяваныя вынікі. Крымінальнікі далучыліся да палітычных. У турме выбухнуў бунт. У многіх камэрах арыштаваныя забарыкадаваліся, разьбілі шкло ў вокнах, паламалі сталы і лавы, раскідалі печы і цаглины выкідвалі праз вокны.

Зараз-жа ў турму прыбыў пракурор Люблінскага акруговага суду. Былі выкліканы пажарныя. якія праз вокны залівалі камэры вадою з брандабоеў. Адначасова камэры асадзіла паліцыя. Начальнік акруговае паліцыі Сабачынскі застрэліў крымінальніка Юзэфа Завадзкага. Барацьба цягнулася больш 2-х гадзін, пасьля чаго бунт удалося ліквідаваць.

Запасныя супроць збораў.

ПАРЫЖ, 8-8. „Юманітэ“ паведамляе падрабязнасьці аб выступленьнях запасных у часе апошніх манэўраў. Выступленьні гэтыя адбываліся ў лягеры Масыў Шампані і ў іх прымалі ўдзел таксама салдаты пастаяннай службы. У апошні дзень манэўраў, запасныя 27 пяхотнага палка ўбавілі хворых. На другі дзень той-жа полк аднадушна адмовіўся ўдзельнічаць у патрыятычнай цэрамоніі каля помніка Фоша. 1-га жніўня па лягеры з рук у рукі хадзіла рэвалюцыйная газэта „Пары де Мазо“. Ня гледзячы на старанныя вобыскі, вінавайцы ня выкрыты.

Па сканчэньні манэўраў, каля паўтары тысячы запасных зварочваліся да дому, яны наладзілі ў Шалоне маніфэстацыю з выгукамі „Прэч вучэбныя зборы“ і пелі Інтэрнацыянал.

Ня гледзячы на тэрор---выйшлі на вуліцы.

ПАРЫЖ, 6-8. „Юманітэ“ піша: «Каб давесьці, што чырвоны дзень ня меў посьпеху, буржуазныя газэты сьцьвярджаюць, быццам партыя задумала 1-га жніўня зрабіць рэвалюцыю ці, па меншай меры. узброенае паўстаньне. Паколькі ні таго, ні другога ня было, вынік па думцы гэтых газэт, ясны—чырвоны дзень праваліўся.

Між тым, кампарты ня мела мэты зрабіць 1-га жніўня паўстаньне. Мэта анты-ваеннага дню—масавы пратэст супроць імпэрыялістычнай вайны—дасягнута ў шырокім маштабе“.

Паход супроць „Юманітэ“.

ПАРЫЖ, 8-8. 5-га жніўня «Юманітэ» выходзіць толькі на 4-х старонках замест 6. Прычына — буйныя штрафы, якія амаль штодзённа накладаюцца на газэту. Як бачым, улада парашыла зьнішчыць „Юманітэ“.

Разам з тым кіраўнікоў газэты арыштоўваюць па кожнаму выпадку і садзяць у астрог па некалькі гадоў. Паход супроць рабоча-сялянскага банку таксама быў накіраваны супроць «Юманітэ», якая зьяўляецца адным з больш буйных кліентаў банку.

Кашэн агаласіў у „Юманітэ“ адозву ў якой заклікае рабочых згуртавацца вакол свайго друкаванага органу і ўсямерна абараняць яго існаваньне.

МАКДАНАЛЬД „КІРУЕ“.

«РАБОЧЫ» ЎРАД НЕ ПАДВЯДЗЕ.

ЛЁНДАН, 9-8. Чэмбэрлен выступіў у Бэльфасьце з прамовай, у якой заявіў, што магчымасьць эвакуацыі ангельскага войска з ваколіц Каіру і Александрыі ў недалёкім будучым непакоіць яго. Чэмбэрлен адкладае сваю капчатковую думку пакуль становішча ня высьвятліцца, але выказвае надзею, што ўрад будзе вырашаць гэтае пытаньне не ў партыйным, а нацыянальным духу.

Джойнсон Хікс агаласіў заяву, у якой востра асуджае прапанаваныя ўмовы ангельска-эгіпецкага саюзу і заяўляе, што яны роўназначны поўнай адмове Англіі ад сваіх правоў у Эгіпце.

МАКДАНАЛЬД ЗРАБІЎ-БЫ „ДОБРА“

ЛЁНДАН, 9-8. Бэрнард Шоу ў гутарцы з супрацоўнікам „Дэйлі Геральд“ заявіў, што заклік Джайнсон Хікса ня мае ніякага значэньня, і як відаць быў проста свайго роду парляманцкай выхадкай. Па думцы Шоу урад Макданальда зрабіў-бы вельмі добра каб ён перадаў свае кантрольныя правы над Суэцкім каналам Лізе Нацый.

КАНСЭРВАТАРЫ ПЕРАМАГЛІ

ЛЁНДАН, 8-8. Агенцтва „Рэйтэр“ паведамляе: «у зьвязку з назначэньнем таварышам міністра ўнутраных спраў Джансона Хікса пэрам і пераходам яго ў палату лёрдаў, у выбарчай акрузе Сьвітэнгем адбыліся дадатковыя выбары. Перамог кансэрватар Хадзісон, які атрымаў 14705 галасоў супроць 14202 галасы атрыманых кандытам рабочай партыі Мэзонам.

ПАСТАНОВА НКЗ БССР № ЗА № БЯЗ №.

Прынясі белую ружу ў Наркамзем і яна вырасьце ў рэспубліканскага чыноўніка..

(Гэта не з пастановы).

Згодна вельмі тэрміновай і строга-сакрэтнай адносіны левай нагі да правай, на падставе ўласнай вясёлай фантазіі, з прычыны анты-рацыяналізацыі і контр-чысткі апарату, з мэтай знаходжаньня таго і гэтага і канчаткованга набліжэньня да адрыву ад працоўных мас, Наркамзем знаходзіць неабходным і своечасовым павесьці рашучую барацьбу з аваднямі на тэрыторыі Беларусі, для чаго неабходна правесьці ў жыцьцё ніжэйнаступнае:

§ 1. Правесьці шырокую растлумачыцельную працу сярод насельніцтва наогул і сялянства ў прыватнасьці, зьвярнуўшы саблівую ўвагу на апарат НКЗ, аўтараў пастановы і асоб, якія яе зацьвярджалі. Скарыстаць для гэтае мэты газэты і часопісі рэспублікі, асигнаваўшы ім для фота-здымкаў аваднёў у розныя часы дню і ў розных позах і выглядах (профіль, амфас, прад усходам сонца, у полудзень, пасьля захаду, у час вальсу, факстроту, лявоніхі). Для набыцьця фота-здымкаў арганізаваць навуковыя экспэдыцыі ў розныя кліматычныя і эканамічныя раёны БССР; запрасіць да ўдзелу ў іх журналістаў і пісьменьнікаў (мастацкае слова заўсёды робіць моцны эфэкт на эмацыянальныя пачуцьці працоўнае масы). Таксама неабходна выдаць і сваю ўласную літаратуру пад агульнай назвай „Авадзень і барацьба з ім“. Распаўсюджваньне літаратуры даручыць ЦРК і сялянскім каапэратывам, якія праз абвёртку прадуктаў шырокага спажываньня ў кароткі тэрмін прасунуць навуковыя кніжкі ў гушчы насельніцтва наогул і сялянства ў прыватнасьці.

§ 2. Практыкаваць чыстку рагатай жывёлы спэцыяльнымі шчоткамі, якія неабходна набыць за граніцаю. Вядома, у час гаспадарчых цяжкасьцяў і правага ўхілу на паркалёвай індустрыі можна заехаць на станцыю з надпісам: «чыстка партыі і апарату», а таму лепш за ўсё набыць на пачатак для папулярызацыі некалькіх адзінак шчотак, для якой мэты камандыраваць у Галяндыю або Данію прафэсара ад Навуковай Навукі Прагуляйлава Гуляя Пагуляевіча.

§ 3. Увесьці выдачу грашовых прэмій за зьбіраньне лічынак авадня, для якой мэты мабілізаваць у першую чаргу рабочую клясу, а потым батракоў, беднякоў і лепшых серадняко́ў, а таксама ўсё сьвядомае, што засталося ў шэрагах працоўнае інтэлігенцыі. Пры разьмеркаваньні прэмій неабходна прытрымлівацца клясавасьці, зьвяртаць увагу на сацыяльны склад прэтэндэнтаў на атрыманьне прэмій, іх паходжаньне, працу да Кастрычнікавай рэвалюцыі і жыцьцё да параджэньня.

§ 4. Забараніць пасьвіць рагатую жывёлу ў тыя гадзіны дню, калі аваднi асабліва балюча кусаюць і турбуюць яе. У самую сьпякоту, паміж 10 і 3 гадзінамі дню, трымаць жывёлу ў пунях і скляпох. А яшчэ лепш за ўсё зусім ня пушчаць жывёлу на пашу, трымаць яе ўсё лета ў ізаляваным ад сьвятла і паветры памяшканьні, схаваную ад вока аваднёвага і зайздрасьці людзкой. Але ўсё такі, як кажуць апошнія дасягненьні агранаміі і вэтэрынарыі, жывёле неабходна сьвятло і паветра, таму яе трэба раз у тыдзень выпушчаць на волю. А каб машкара не перашкаджала прагулцы жывёлы, устанавіць для аваднёў дзень адпачынку (лепш за ўсё ў нядзелю, калі большасьць супрацоўнікаў Наркамзему выяжджаюць за горад на дачу). Гэта пытаньне ўзгадніць з Наркампрацы.

§ 5. Адказнасьць за выкананьне пунктаў 1, 2, 3 і 4 ускласьці на пастухоў, міліцыю, сьвядомую савецкую грамадзкасьць і само насельніцтва, якое, бязумоўна, не павінна быць незацікаўленаы ў гэтым. Каб падрыхтаваць баявы авангард для кіраўніцтва гэтай працай, хадатайнічаць прад вышэйшымі органамі, каб яны далі загад зацікаўленым арганізацыям, каб тыя запрапанавалі старшыні ЦП рабзямлесу Вайтэнку, і каб той знайшоў сродкі ў каго-небудзь і як-небудзь і арганізаваў курсы нізавых пастухоў.

Чытаць тактыку барацьбы з аваднямі на гэтых курсах даручыць намесьніку НКЗ Адамовічу, а стратэгію—інспэктару па эпізоцыі і саннагляду Жарыну. Тыя асобы, якія будуць парушаць гэтую пастанову, будуць прыцягвацца да адміністрацыйнай адказнасьці і высылцы этапным парадкам на першыя пазыцыі тэатру вайсковых падзей барацьбы з аваднямі.

Наркамзем НАРКАМЗЕМАЎ.

З арыгіналам згодна.
Няштатны сэкратар
ЦІМ. ЗАРЭЧНЫ.

Падпіска на III пазыку індустрыялізацыі.

Пачын пакладзен.

4-га жніўня г. г. па дакладу аб III-й пазыцы індустрыялізацыі пленум Мачаскага сельсавету, Бярэзінскага райёну, калектыўна падпісаўся на 3-ю пазыку індустрыялізацыі краіны на суму—100 руб. і выклікае пасьледаваць яго прыкладу Дулебскі і Высакагорскі сельсаветы Бярэзынскага райёну.

Разам з гэтым пленум вынес пастанову правесьці працу сярод насельніцтва вёсак. Кожны сябр пленуму абавязаўся правесьці падпіску ня меней, як 15 р. па свайму пункту, што складзе каля 400 руа.

Сам.

ВЫПЛАЧАНА ВЫЙГРЫШАЎ НА 8720 РУБ.

Беларуская кантора Дзяржбанку па ўчорашні дзень выплаціла выйгрышаў па апошняму тыражу 2-й пазыкі індустрыялізацыі на суму 8720 руб.

Пазаўчора ў бани прад'яўлена для аплаты аблігацыя 2-й пазыкі, на яную прыпаў выйгрыш у 5000 руб.

БОЛЬШ ЧЫМ НА 100 ПРОЦ.

63 рабочых і служачых „Совторгфлота“ сабралі падпіскі на 3 пазыку індустрыялізацыі на 6200 руб. Месячная-ж заработная плата ўсяго калектыву окладае толькі 5764 руб. Такім чынам рабочыя „Совторгфлота“ лёзунг ня менш 100 проц. месячнага заработну ў пазыку дзяржаве выканалі з правышэньнем.

ДЗЯРЖБАНКУ АФОРМЛЕНА ПАДПІСКА НА 220.000 РУБ.

Па ўчорашні дзень у Беларускай канторы дзяржбанку аформлена падпіскі на 3 пазыку індустрыялізацыі на суму каля 220000 руб.

РАЗАМ З УСІМІ.

Працаўніці працалектыву фатографаў у ліку 14 чалавек сабралі падпіскі на 3 пазыку індустрыялізацыі на 1005 руб., што складае 100 проц. месячнага заработку.

СУМУ ПАДПІСКІ ПАВЯЛІЧАЦЬ.

Рабочыя працалектыву паліграфвытворчасьці ў ліку 60 чалавек падпісаліся на пазыку індустрыялізацыі на 2915 руб. У працалектыве-ж працуе 75 чалавек. Пасьля сканчэньня водпускнай кампаніі суму падпіскі мяркуюць павялічыць.

НЕ АДСТАЛІ І „НАРПИТОВЦЫ“.

З 60 рабочых і служачых сталоўні Менскага ЦРК № 8 на пазыку індустрыялізацыі падпісаліся 56 чалавек на 4350 руб., між тым, як заработак 60 чалавек складае ў месяц 3478 руб. Многія падпісваліся на 150-200 проц. свайго месячнага заработку.

IV ТЫРАЖ ВЫЙГРЫШАЎ ПА 2-Й ПАЗЫЦЫ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ.

Чарговы IV тыраж выйгрышаў па 2 пазыцы індустрыялізацыі адбудзецца 20 верасьня ў г. Тыфлісе. Пяты тыраж адбудзецца ў Новым Сібірску 20 сьнежня бягучага году.

ЧАРГОВЫ ТЫРАЖ ПА 1 ПАЗЫЦЫ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ.

20 жніўня адбудзецца чарговы тыраж выйгрышаў па 1 пазыцы індустрыялізацыі. Тыраж будзе праведзен у Арцемаўску. Сярод больш буйных выйгрышаў будуць разыграны: 1 у 25000 р., 3—па 10000 р., 10—па 5000 р. і шэраг іншых.

ЗАДАНЬНЕ ВЫКАНАЛІ.

Рабочыя друкарні Беларускай акадэміі навук горача адгукнуліся на заклік партыі і ўраду прыняць удзел у рэалізацыі новай пазыкі індустрыялізацыі. 33 рабочых падпісаліся на 100 проц. свайго месячнага заработну на суму 2350 руб.

СВАЕЧАСОВА ПАДРЫХТАВАЦЦА

Першая ўсебеларуская выстаўка с.-г. і прамысловасьці, па сутнасьці, складае частку нашае працы, якая ўваходзіць у 5-цігодку па рэканструкцыі ўсяе народнае гаспадаркі БССР і, у прыватнасьці, сельскае гаспадаркі. Сельска-гаспадарчая выстаўка ёсьць вялікі стымул да падвышэньня ўраджайнасьці, значыць—да паляпшэньня тэхнікі апрацоўкі, ужываньню штучных угнаеньняў, пасеў ачышчаным і гатунковым насеньнем і г. д. Наша выстаўка будзе зусім адрозьнівацца і па структуры і ўстаноўцы ад буржуазных с.-г. выставак. Вось што піша наконт гэтага дырэктар выстаўкі тав. Дубіна: „Гэта выстаўка па сэнсу сваёй арганізацыі будзе зусім адрозьніваца ад выставак буржуазных краін, дзе выстаўкі наладжваюцца, як рэклама, як кірмаш, з мэтай камэрцыйнага спаборніцтва індывідуальных гаспадарак багацееў і паасобных фірм капіталістаў, з мэтай нажывы буржуазеі і чорнай біржы.

Наша выстаўка зьявіцца грандыёзнай калектыўнай дэманстрацыяй дасягненьняў рабочае клясы.

Выстаўка адчыніцца ў жніўні 1930 г. У Менску гэта будзе першы экзамен, першая спроба таго, як мы спраўляемся з пяцігодкаю, як мы яе ўсвоілі і як да яе падрыхтаваліся на працягу гадавой працы. Гэта праверка, як непасрэдных выканаўцаў пяцігодкі, так і галоўным чынам, яе камандзіраў і аграномаў, лесаводаў, каморнікаў і мэліаратараў у сельскай гаспадарцы, інжэнэраў і тэхнікаў у прамысловасьці. Выстаўка дасьць магчымасьць кожнаму з іх паказаць свае здольнасьці і ініцыятыву. Асноўны лёзунг выстаўкі: як наймені штучнасьці, найбольш натуральнасьці. Задачы, якія выставачны камітэт ставіць у арганізацыі выстаўкі, практычна выцякаюць з пастаноў XV партзьезду ўсеКП(б) і XII зьезду КП(б)Б у галіне гаспадарчага будаўніцтва. Ці гатовы мы да выкананьня ўсіх намечаных задач? Ці зможам мы своечасова выканаць у гэтай галіне заданьні нашае партыі і ўлады? Адказ павінен быць цьвёрды і ясны: мы выканаем! Але-ж да гэтага часу мы дрэнна падрыхтоўваемся і гэта наша вялікая небясьпека. На мясцох, калі і створаны выстаўкомы ў акругах, дык на гэтым справа і стаіць. Насельніцтва зусім не падрыхтавана да гэтага часу да выстаўкі і нават шмат населеных пунктаў па Беларусі зусім нічога ня ведаюць пра выстаўку. Неабходна зараз-жа распачаць самую шырокую растлумачальную працу. Грамадзкая думка перш за ўсё. На мясцох неабходна з'арганізаваць увесь калектыў працоўных.

Наш камсамол быў заўсёды ў першых шэрагах. На долю камсамолу прыпала вялікая роля ў працы па падвышэньні ўраджайнасьці і ў паходзе за арганізацыю с.-г. выстаўкі, за наўнату яе натуральнасьці, за падрыхтоўку мас да яе, ЛКСМБ павінен быць першым.

Пастанова ўраду аб арганізацыі і падрыхтоўцы да с.-г. выстаўкі была зроблена яшчэ ў 1927 г. у лістападзе, ды, нажаль, праца распачынаецца толькі цяпер. У вёсках павінна быць зараз жа ўтвораны ячэйкі садзейнічаньня ў дапамогу райённым і сельсавецкім выставачным камітэтам падрыхтоўцы да 1-й усебеларускай сельска-гаспадарчай прамысловай выстаўкі.

Беднякі і серадняки і, наогул, увесь актыў вёскі поруч з камсамолам, з аграномам, павінны ўзяцца за падрыхтоўку да 1-й с.-г. і прамысловай выстаўкі! Калгасы і савгасы павінны быць першымі па своечасовасьці і акуратнасьці падрыхтоўкі. Яны павінны і на выстаўцы паказаць сваю магутнасьць сацыялістычных баз, вакол якіх будзе гуртавацца не аб'яднаны, распылены да гэтага часу індывідуальны сэктар сельскай гаспадаркі. Нашы райёны цяпер ужо маюць шмат аграпрацаўнікоў, якія павінны з энтузіязмам узяцца за працу па падрыхтоўцы да выстаўкі. Правядзеньне асеньняе пасеўнае кампаніі неабходна праводзіць пад лёзунгамі падвышэньня ўраджайнасьці і падрыхтоўкі да с.-г. выстаўкі. Калгасам і савгасам ужо можна даць поўныя заданьні пэрсанальна кожнаму па ўсіх галінах сельскае гаспадаркі, а таксама і іншым каапэрацыйным аб'яднаньням. У працу неабходна ўцягнуць аграпаўнаважаных, каб пра с.-г. выстаўку ведаў кожны двор. Выстаўка адчыніцца ў такі пэрыяд, калі мы ня зьбярэм яшчэ з поля ярыну, а мо ня скончым яшчэ і збор азімых, таму значная колькасьць экспанатаў па расьлінаводзтву, як снопікі, узоры насеньня збожжа, траў і г. д. павінны быць падрыхтаваны сёлета і належным чынам захаваны.

Як мага шырэй трэба скарыстаць выстаўкі дню ўраджаю гэтага году. Сёлета яны павінны быць праведзены, як падрыхтоўчыя да 1-й усебеларскай с.-г. выстаўкі. Экспанаты па жывёлагадоўлі павінны нямячацца таксама зараз-жа.

У падрыхтоўку павінны быць уцягнуты ўсе, незалежна ад разьвёрсткі колькасьці экспанатаў па акругах і райёнах, цесна зьвязаўшы гэтую працу з конкурсам на лепшы с.-г. райён. Напэўна пры адборы экспанатаў па 1-ю ўсебеларускую с.-г. выстаўку, акругов. выставак у 1930 г. арганізоўваць ня прыдзецца, а райённыя будуць неабходны ў пэрыяд чэрвень-ліпень, але не пазьней 15-7-30 г., каб адабраныя экспанаты да 1 жніўня ўжо былі на выстаўцы ў Менску. Гэта ня выключае магчымасьці і неабходнасьці адбору экспанатаў і да выставак у райёнах, непасрэдна ў гаспадарках. Цяпер павінен памячацца максымум экспанатаў па ўсіх галінах, з якіх можна будзе выбіраць патрэбную колькасьць. У дзень ураджаю ў 1930 г. райённых выставак ня будзе, бо ў гэты час 1-я ўсебеларуская с.-г. прамысловая выстаўка будзе ў Менску. Тэмп-жа падрыхтоўкі павінен быць ня звычайны, бо часу засталося мала. Пакуль што месцы поўных належных інструкцый аб падрыхтоўцы паасобных экспанатаў для с.-г. выстаўкі не атрымалі, але гэта ніколькі не перашкаджае разгортваньню і шпаркасьці падрыхтоўкі.

С.

АБ АРГАНІЗАЦЫЙНА-ПАРТЫЙНАЙ РАБОЦЕ У СУВЯЗІ З НАДЫХОДЗЯЧАЙ ХЛЕБАЗАГАТОЎЧАЙ КАМПАНІЯЙ.

(Зацьверджана ЦК УсеКП(б) 29 ліпеня 1929 году).

IV.

7. Неабходна актыўная і ўсебаковая дапамога хлебазагатоўчым арганізацыям з боку ўсіх грамадзкіх арганізацый.

Вясковыя камсамольскія ячэйкі павінны разгарнуць шырокую масавую работу ў сувязі з хлебазагатоўкамі. Камсамольскія ячэйкі павінны выяўляць ініцыятыву ў разгортваньні спаборніцтва па хутчэйшай рэалізацыі пляну хлебазагатовак, шырока скарыстоўваючы асабістую ініцыятыву камсамольцаў, якія павінны поруч з камуністамі паказваць прыклад у выкананьні абавязацельстваў па хлебазагатоўках, выступаць арганізатарамі чырвоных абозаў, выклікаць на спаборніцтва другіх гаспадароў і г. д. Камсамольскія арганізацыі павінны прыцягваць сялянскую моладзь на дапамогу камісіям садзейнічаньня і хлебазагатоўчым органам, шырока скарыстаць «лёгкую кавалерыю» для палепшаньня работы як хлебазагатоўчага апарату, так і арганізацый, адказваючы за дастаўку ў вёску прамтавараў.

Неабходны актыўны ўдзел камсамольскіх рабочых арганізацый у фармаваньні рабочых брыгад з гораду.

8. Вопыт мінулага году паказвае, што кулацкія элемэнты ў сваім супраціўленьні мерапрыёмствам савецкай улады спрабуюць арганізоўвацца і абапірацца ў першую чаргу на падтрыманьне адсталых пластоў сялянства. Пагэтаму ўсе партыйныя арганізацыі павінны разьвіць вялікую масавую работу сярод сялянак, паставіўшы на ўвесь пэрыяд загатоўчай кампаніі ў цэнтры ўвагі дэлегацкіх сходаў садзейнічаньне хлебазагатоўкам. Пры гэтым неабходна правядзеньне растлумачальнай работы сярод дэлегатак, а таксама згуртаваньне жаночага актыву (з батрачак, з папярэдніх складаў дэлегацкіх сходаў, з каапэрацыйнага, савецкага актыву і інш.) для дапамогі правядзеньню хлебазагатовак. Неабходна выдзеляць у камісіі садзейнічаньня найбольш актыўных сялянак. У гарадох дэлегацкія сходы павінны паставіць пісьмовую і жывую сувязь з вёскаю, уключаючы работніц у брыгады, выяжджаючы на сяло.

9. Прафсаюзныя арганізацыі ў мінулую кампанію прымалі вельмі недастатковы ўдзел у правядзеньні хлебазагатовак. У будучую кампанію ўсе прафсаюзныя арганізацыі як гораду, так і вёскі павінны выявіць максымум актыўнасьці ў правядзеньні як хлебазагатовак, так і ўсіх мерапрыёмстваў, забясьпечваючых найбольш хуткае і поўнае выкананьне хлебазагатоўчага пляну.

Прафарганізацыі павінны правесьці растлумачальную работу сярод сваіх членаў аб задачах і значэньні хлебазагатоўчай кампаніі, у прыватнасьці арганізаваць членаў прафсаюзаў, маючых сваю гаспадарку ў вёсцы, у якасьці ініцыятараў датэрміновай і тэрміновай здачы хлеба дзяржаве.

Неабходна, каб рабочыя брыгады вялі ня толькі растлумачальную работу па хлебазагатоўках, але ўвязвалі свой удзел у правядзеньні хлебазагатовак з работай па падрыхтоўцы будучай с.-г. пасеўнай кампаніі, арганізуючы вытворчую дапамогу сялянскай гаспадарцы.

Прафсаюзныя арганізацыі павінны забясьпечыць удзел нізавых прафорганаў у справе правядзеньня масавага грамадзкага кантролю над работай нізавога хлебазагатоўчага апарату і каапэрацыі.

Прафсаюзы павінны арганізаваць усю гэту работу ў вёсцы, прыстасоўваючыся да асаблівасьцяў аб'яднаемай саюзам масы, у прыватнасьці саюз савгандальслужачых павінен уцягваць шырокія масы сваіх членаў у справу палепшаньня работы хлебазагатоўчага апарату, каапэрацыі, ссыпных пунктаў і г. д.

Саюзы працасьветы (таксама мэдсанпрацы) павінны прыцягнуць да хлебазагатоўчай кампаніі вясковую інтэлігэнцыю, асабліва для растлумачальнай работы сярод бядняцкіх і серадняцкіх мас у першую чаргу праз школы і іншыя культурныя ўстановы.

Саюз сельска-гаспадарчых рабочых павінен дабіцца актыўнага ўдзелу масы арганізаваных і неарганізаваных с.-г. рабочых і батракоў у рабоце груп беднаты, у дапамозе камісіям садзейнічаньня і г. д. У прыватнасьці ён павінен прыцягваць батракоў, працуючых у кулацкіх гаспадарках, для барацьбы супроць кулацкіх спроб зрыву хлебазагатовак.

Саюз будаўнічых рабочых павінен паставіць масавую работу сярод сэзоньнік ў, дамагаючыся таго, каб гэтыя кадры рабочых былі ініцыятарамі і арганізатарамі хлебазагатоўчай кампаніі ў сяле на сяле.

10. Разгортваньне масавай работы с.-г. і спажывецкай каапэрацыі і мабілізацыя вакол задач хлебазагатоўчай кампаніі ўсяго каапэрацыйнага актыву на аснове правядзеньня пралетарскай клясавай лініі ў рабоце каапэрацыі зьяўляюцца аднэй з важнейшых умоў выкананьня хлебазагатоўчага пляну.

Неабходны першачарговая і поўная здача сваіх таварных лішкаў каапэрацыйным і савецкім актывам, калгасамі і вытворчымі аб'яднаньнямі; своечасовы збор закантрактаванай прадукцыі; актыўны ў

ПЕРАД НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДАМ.

Даб'ёмся рашучага пералому ў справе зьнішчэньня няпісьменнасьці.

Савецкая Беларусь займае 13 месца на ліку пісьменых паміж іншых райёнаў Савецкага Саюзу і налічвае на кожную тысячу насельніцтва ўсяго 407 чалавек пісьменных. Беларусы-ж на пісьменнасьці займаюць аж 24 месца сярод іншых народаў СССР (па матар'ялах усесаюзнага перапісу 1927 г. «Педагогическая экспедиция», т. III, ст. 787-790).

Калі гэтыя данныя параўнаць з тымі вялізарнымі задачамі па індустрыялізацыі краіны, з тым тэмпам разьвіцьця гаспадаркі, якія намячаюцца няцігадовым плянам, стане зусім ясным і тая актуальнасьць працы ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці і неблісьпека тых „ножніц", аб якіх гаварыў тав. Рыкаў у сваей прамове на XV зьезьдзе УсеКП(б). У гэтай прамове ён сказаў: «Я лічу зусім бясспрэчным, што ў нас культурнае разьвіцьцё значна адстае ад нашага гаспадарчага разьвіцьця і падвышэньня жыцьцёвага ўзроўню рабочых і сялян..., што ажыцьцяўленьне індустрыялізацыі і ўздым гаспадаркі надалей ня могуць адбывацца без роўналежнага ўздыму культурнага ўзроўню краю»...

Гэткая пастаноўка пытаньня і тая трывога за культурнае будаўніцтва, што адчуваецца ў гэтай прамове, могуць быць у большай ступені аднесены да БССР у зьвязку з вышэйпаказанымі данымі. Бо нельга-ж, сапраўды, весьці стала культурнае будаўніцтва, калі мы маем больш 50 проц. няпісьменных. А таму **задача ліквідацыі няпісьменнасьці павінна стаць аднэй з актуальнейшых задач сацыялістычнага будаўніцтва.**

Гэта задача можа быць вырашана толькі праз мабілізацыю самых шырокіх мас працоўнага насельніцтва пры напружанай працы, побач з дзяржаўнымі ўстановамі, усіх грамадзкіх арганізацый. Між тым, факты і лічбы сьведчаць аб рэальнай небясьпецы на гэтым фронце. Лічбы сьведчаць вось аб чым. Пэрспэктыўны плян па ліквідацыі няпісьменнасьці ў мінулым годзе быў выканан усяго на 47 проц.; замест намечаных па тым-жа пляне 5 р. 73 кап. на ліквідацыю няпісьменнасьці аднаго няпісьменнага выдавалася ўжо 3 р. 29 к., а ўвогуле на ліквідацыю няпісьменнасьці было асыгнавана ўсяго 46,7 проц. намячаемага пляну (з афіцыйнай справаздачнасьці НК асьветы).

Сьмешным, вядома, было-б думаць, што толькі за кошт дзяржаўных арганаў можна весьці барацьбу з ліквідацыяй няпісьменнасьці. Тут патрэбна мабілізацыя ўвагі і сродкаў грамадзкіх, каапэрацыйных, прафэсыянальных арганізацый. Між тым, тыя-ж лічбы і факты сьведчаць вось пра што: прафсаюзы за свой кошт у мінулым годзе навучалі ўсяго 1,7 проц. агульнага ліку няпісьменных, замест прызначаных ім на пляну 10 проц.; сыстэмай спажывецкай каапэрацыі БССР на культработу было выдадзена за год 625 тысяч руб.,—гэтыя грошы траціліся на што хочаце, а вось на ліквідацыю няпісьменнасьці, хоць-бы сярод сваіх пайшчыкаў, было выдадзена ўсяго 31 тысяча руб. (матар'ялы культнарады пры Белкаапсаюзе).

Т-ва „Прэч Няпісьменнасьць", якое навінна было-б быць баявым органам у справе мабілізацыі шырокіх колаў працоўных вакол ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі і ўлады ў справе ліквідацыі няпісьменнасьці, таксама з ускладзенымі на яго задачамі не спраўлялася.

Урэшце, і ў органах НК асьветы была недаацэнка важнасьці справы ліквідацыі няпісьменнасьці, ня было патрэбнага кантролю над скарыстаньнем тых сродкаў, якія асыгноўваліся дзяржавай на ліквідацыю няпісьменнасьці. А калі яшчэ да ўсяго гэтага дадаць, што адсеў на лікпунктах складае надзвычайна вялікі процант (звыш 40 проц.), што рэцыдыў няпісьменнасьці ў выніку неўцягненьня ліквідаваўшых няпісьменнасьць ва ўсю сыстэму масавай палітасьветнай працы складае ізноў такі больш за 25 проц., дык стане зусім ясным, што пры такім становішчы і пры гэткай увазе ўсіх арганізацый да гэтай надзвычайна важнай задачы **дырэктыва XII зьезду КП(б)Б, вызначыўшая скарачэньне ліку няпісьменных за пяцігодзьдзе з 725 тысяч да 177 тысяч, стаіць над пагрозай невыкананьня.**

Трэба адзначыць яшчэ адну асаблівасьць, якая характарызуе няўважлівыя адносіны да справы ліквідацыі няпісьменнасьці, адсутнасьць выразнай клясавай лініі ва ўсёй гэтай рабоце, асабліва на вёсцы. Няпісьменнасьць ліквідуецца **увогуле**, ня ставіцца задача навучыць грамаце ў **першую чаргу** рабочых, батрацтва, калгасьнікаў, вясковую беднату. Тут таксама патрэбен рашучы пералом.

Ня гледзячы на цэлы шэраг посьпехаў, аб якіх нельга не сказаць, усё-ж справа ліквідацыі няпісьменнасьці ў нас як сьлед не разгорнута. У нашых арганізацый (саюзы, т-ва «Прэч няпісьменнасьць», каапэрацыя, НК асьветы) ёсьць яшчэ занадта багата казённага спакою. Усе іхныя меркаваньні прасякнуты залішне аптымізмам. І што асабліва дрэнна, дык гэта тое, што падрыхтоўка да новага навучальнага году ідзе вельмі квола. Ні т-ва «ПН», ні партыйныя ячэйкі, ні прафсаюзы яшчэ не ўзварушылі грамадзкай думкі, не мабілізавалі ўвагі шырокіх колаў працоўных наваколь гэтай актуальнай задачы. Пляны і меркаваньні пакуль што мяркуюцца, будуюцца, перакройваюцца ў канцэлярыях і габінэтах, а тым часам пачатак навучальнага году не за гарамі.

Між тым у гэтай справе самім жыцьцём вылучаюцца на наступны год такія задачы, як поўная ліквідацыя няпісьменнасьці сярод рабочых і работніц, сельска-гаспадарчых рабочых, ліквідацыя няпісьменнасьці хоць-бы на 50 проц. калгасьнікаў і г. д.

Выкананьне гэтага пляну патрабуе і новых форм працы. Побач з лікпунктам павінна шырока разгарнуцца праца па індывідуальнаму навучаньню няпісьменных. У гэтай справе апрача сяброў т-ва „ПН", (бо гэта іхняя асноўная задача) павінны прыняць актыўны ўдзел партыйцы, камсамольцы настаўніцтва, уся савецкая інтэлігэнцыя, пралетарскае студэнцтва ды інш. Гэту іхную працу трэба прыраўнаць да партыйнай і грамадзкай нагрузкі. Пралетарская грамадзкасьць ставіць ужо цяпер перад гэтымі арганізацыямі пытаньне: „Колькі-ж чалавек ваша арганізацыя навучыць грамаце?" Ні ад воднай з гэтых арганізацый мы пакуль што яшчэ ня чулі адказу на гэта запытаньне, і што імі тут зроблена, ніхто ня ведае. А між тым посьпех будзе забясьпечаны толькі тады, калі ўся праца будзе весьціся пад неаслабным кантролем грамадзкасьці. Трэба зараз-жа распачаць месячнік граматнасьці з тым, каб, мабілізаваўшы на працягу гэтага году ўвагу ўсіх працоўных, разгарнуць на працягу ўсяго году масавы культурны паход і дабіцца рашучага пералому ў гэткай важнай і адказнай справе.

Партыйныя арганізацыі павінны стаць на чале ўсёй гэтай працы.

Урэшце, наступны год павінен даць ня толькі колькаснае павялічэньне працы, але і якаснае палепшаньне яе.

Ал. Некрашэвіч.

Рыхтуем новыя кадры настаўнікаў.

Рыхтуемся да шырокай грамадзкай чыннасьці.

Менскія 4-хмесячныя настаўніцкія курсы наведваюць 156 слухачоў, з іх 50 мужчын і 106 жанчын.

Пераважны лік слухачоў—беларусы (102 чал.) ды яўрэі (50 чал.).

Па сацыяльнаму складу ўсе курсанты падзяляюцца так: рабочых—34 ч., служачых—45 чал., сялян—43 чал. (беднякоў—10, батракоў—3 чал., сераднякоў—30 чал.), саматужнікаў ды інш.—34 чал.

На курсах выкладаецца грамадазнаўства з мэтодыкай, беларуская мова і літаратура, гісторыя Беларусі і рэвалюцыйны рух на Беларусі, мэтодыка краязнаўства. Самае галоўнае месца ў навучальным пляне займаюць пэдагогіка, пэдалёгія, школазнаўства, асновы працоўнае школы і мэтодыка матэматыкі. Не забыты ў нас і мэтодыка працы з дарослымі, асновы каапэраваньня і калектывізацыі, піанэррух, вывучэньне ваенізацыі ў школе.

Праца ідзе шпарка. Нават немагчыма ўсе ўлічыць. Часу мала, а заданьне выканаць трэба. Але пры пільным стараньні спадзяемся на посьпех.

Курсант **Лапіцкі Р.**

Аршанскі Пэдтэхнікум перагружан заявамі.

На 1-е жніўня ў Аршанскі Пэдтэхнікум было пададзена 256 заяў, з гэтага ліку ад мужчын—135, а ад жанчын—121 заява.

Сацыяльны склад паступаючых наступны: рабочых і дзяцей—23, сялян беднякоў—84, сялян сераднякоў—92, дзяцей настаўнікаў—14, калгасьнікаў—2, дзяцей саматужнікаў—10, выхаванцаў дзіцячых дамоў—3, дзяцей служачых—28.

Згодна дадатковаму тлумачэньню НКА прыём заяў працягнуты да 20-га жніўня такім чынам, паказаная вышэй лічба значна павялічыцца, бо штодзённа яшчэ паступаюць заявы. Норма-ж прыёму ў гэтым годзе па Аршанскаму Пэдтэхнікуму—90 чал.

Адсюль паўстае наступны малюнак: калі залічыць толькі дзяцей рабочых і сялян-беднякоў, дык іншыя сацыяльныя катэгорыі паступаючых ня змогуць зусім быць прынятымі. З другога боку, пры кватэрным крызісе г. Воршы і пры наяўнасьці 50-60 проц. стыпэндыяльнага фонду задаволеньня паступаючага складу (норма НКА),—ствараюцца цяжкія ўмовы, бо згодна пададзеных дакумантаў, паступаючыя ад рабочых і беднякоў сялян, патрабуюць стыпэндый у больш значнай агульнай колькасьці, чым дазваляе вызначаная норма НКА.

Разам з гэтым паўстае пытаньне—як быць з дзяцьмі іншых сацыяльных груп, у прыватнасьці, з сялянамі-сераднякамі і дзецьмі настаўнікаў.

Магчыма, што па іншых пэдтэхнікумах заяў пададзена не ў дастатковай колькасьці, таму варта было-б НКА, вывучыўшы гэта пытаньне, зрабіць перасоўкі паступаючых па суседніх акругах.

Трэба вітаць пастанову НКА аб адчыненьні ў г. Воршы 2-х гад. пэдкурсаў і аб працягненьні прыёму заяў для паступаючых на гэтыя курсы, бо зусім слушна, што значная частка няпрынятых у тэхнікум зможа быць залічанай на курсы.

М. Цэхановіч.

Дадатковы прыём у Мсьціслаўскі пэдтэхнікум.

У Мсьціслаўскім пэдтэхнікуме сёлета ёсьць 20 вакансій на IV курсе і да 30 на трэцім курсе. Паводле загаду Наркамасьветы, гэтыя вакансіі будуць замяшчацца па агульных правілах прыёму студэнтаў у пэдтэхнікумы на 1929-30 год, за выключэньнем пункту аб адукацыі.

— У адносінах адукацыі пэдтэхнікум будзе кіравацца наступнымі прынцыпамі:

На 4 курс залічаюцца бяз іспытаў асобы, якія скончылі 2-хгадовыя пэдкурсы і маюць аднагадовы пэдагагічны стаж; з 9-кі і агульна-адукацыйныя курсы з 2-хгадовым пэдагагічным стажам.

На 3 курс залічаюцца бяз іспытаў скончыўшыя 9-кі, агульна-адукацыйныя курсы ў 1926-27 г., 1927-28 г., 1928-29 г.; з іспытамі па матэматыцы, роднай мове і грамадазнаўству за 2 гады пэдтэхн. тыя асобы, якія раней скончылі 9-кі і агульна-адукацыйныя курсы.

Настаўнікі, якія цяпер працуюць у школе і маюць стаж ня менш 5 гадоў, скончыўшыя 6. другакласныя, вышэйшыя пачатковыя школы і вытрымаўшыя іспыты на назву вясковага настаўніка, і скончыўшыя 7-кі залічваюцца на III курс з іспытамі па грамадазнаўству за першыя 2 гады п-тэхн. і па беларускай мове. Іспыты для гэтай катэгорыі настаўнікаў могуць быць адтэрмінаваныя і зданы на на працягу ўсяго навуч. году.

Усе іншыя асобы, якія жадаюць паступіць на 3 курс пэдтэхнікуму, павінны трымаюць іспыты за 2 курс пэдтэхнікуму.

Узрост для 3 курсу ўстаноўлены ад 17 да 22 год і для 4 курсу—ад 18 да 30 гадоў.

Пры разьмеркаваньні стыпэндыяў, у выпадку роўных матар'яльных і сацыяльных умоў, настаўнікам будзе даваца перавага.

П. Лаўроў.

Посьпех забясьпечан.

Праца пэдкурсаў пры Рагачэўскім Белпэдтэхнікуме.

Курсы адчыніліся 20 чэрвеня і працягнуцца да 1 кастрычніка. Прынята 110 чалавек са скончыўшых дзевяцігодкі і агульна-адукацыйныя курсы. Пераважны сацыяльны склад курсантаў—дзеці рабочых і бяднейшых сялян. Усе курсанты падзелены на два курсы. Праца вядзецца і лябараторна (з кожным курсам паасобку) і ў форме гутаркі, лекцый (з абодвума курсамі разам). Прыблізна палова з агульнай колькасьці гадзін прыпадае на тую і другую форму працы. Штодзень бывае 7 лекцый.

Працуюць гурткі палітычны, літаратурны і іншыя. Найбольш актуальныя пытаньні літаратурнага гуртка: шляхі і плыні беларускай і расейскай літаратуры: што пісаць, як пісаць і г. д.

Добры кірунак меў культурна-бытавы вечар, на якім супольная дыскусія курсантаў і настаўнікаў аб калектывізьме і мяшчанстве ў быту зацягнулася да позняй ночы.

11 ліпеня разам з райкомам саюзу працасьветы адбыўся і зрабіў добрае ўражаньне вечар, прысьвечаны вызваленьню ад белапалякаў. Зараз вядзецца падрыхтоўка да культпаходу ў вёскі Збарова і Ходасэвічы.

Некатораю перашкодаю ў працы трэба лічыць адсутнасьць сталага памяшканьня пад інтэрнат, ня зусім здавальняючае яго абсталяваньне, адсутнасьць стабілізаваных праграм і літаратуры ў патрэбнай колькасьці, асабліва на грамадазнаўчых і пэдагагічных дысцыплінах.

Да працы курсанты адносяцца старанна, ёю зацікаўлены. У пасьпяховасьці ўжо ёсьць вынікі, а таму ёсьць надзея, што ў далейшым курсанты з працай справяцца і ў пераважнай большасьці будуць сапраўднымі чырвонымі настаўнікамі.

Я.

2-гі пэдтэхнікум на Полаччыне

Полацкі Акруговы інспэктарыят Нарасьветы адчыняе ў бягучым навучальным годзе пэдагагічны тэхнікум у м. Лепель, які разьлічан на 90 асоб.

Гэта будзе другі на Полаччыне пэдтэхнікум.

Будаўніцтва 4-х карпусоў Унівэрсытэцкага Гарадка падыходзіць к канцу.

Да 1 лістапада будуць гатовы мэдыцынскі і анатамічны карпусы, а прыродазнаўчы і хімічны—да 1 сьнежня.

Архітэктар Лаўроў у гутарцы з нашым супрацоўнікам абмаляваў становішча будаўніцтва на Унівэрсытэцкім і клінічным гарадках, а таксама і на пабудове Беларускай Дзяржаўнай Бібліятэкі.

На Унівэрсытэцкім гарадку ў мэдыцынскім і анатамічным карпусох заканчваецца ўкладка паркетнай падлогі, ідуць к канцу работы па абсталяваньню вадаправоду, каналізацыі, ацяпленьня, вэнтыляцыі і газу. Ідзе таксама к канцу і атынкоўка ніжніх паверхаў абодвых карпусоў.

У прыродазнаўчым корпусе праводзіцца ўстаноўка катлоў цэнтральнай кацельнай, праводзіцца атынкоўка кесонных перакрыцьцяў над галоўным вэстыбюлем і выводзяцца сьцены аранжарэі.

На хімічнаму корпусу ў поўным разгары работы на атынкоўцы усіх паверхаў другога крыла корпусу, які выходзіць на цова пракладзенную вуліцу.

Усе пералічаныя 4 карпусы з надворку амаль ужо атынкаваны, ідзе работа па ашкляваньню законных пералётаў, навешваюцца дзьверы. Становішча работ па гэтых корпусах дае магчымасьць з упэўненасьцю сказаць, што ў вызначаныя ўрадавай камісіяй тэрміны яны будуць гатовы для карыстаньня. Мэдыцынскі і анатамічны карпусы будуць здадзены праўленьню БДУ да 1 лістапада, а два апошніх—да 1 сьнежня.

Па галоўнаму аўдыторнаму корпусу заканчваецца кладка апошняга паверху. Ідзе бэтаніраваньне жалеза-бэтонных перакрыцьцяў галоўнага вэстыбюля і актавай залі. У бягучым будаўнічым сэзоне аўдыторны корпус будзе пакрыты з тым, каб у зімовы пэрыяд весьці работы па насьцілцы чорнай падлогі, устаноўцы законных і дзьвярных камплектаў, сходак і г. д. Галоўны аўдыторны корпус мяркуецца скончыць да 1 жніўня 1930 году.

Справа з будаўніцтвам клінічнага гарадка стаіць так:

У сучасны момант ужо ідзе каменная кладка сьцен першых трох карпусоў, прычым па двух карпусох заканчваецца кладка верхніх паверхаў, а па трэцяму—пачалася кладка сьцен першага паверху.

6 жніўня Наркамасьветы зацьвердзіў праэкт чацьвёртага корпусу—пасьля скура-вэнэрычных хваробах. Будаўніцтва гэтага корпусу пачнецца ў бліжэйшыя дні і ў бягучым сэзоне ён будзе скончан учарне. Яшчэ ў бягучым годзе ўсе гэтыя карпусы будуць перакрыты, каб узімку можна было весьці работы па ўнутраному абсталяваньню.

Распачаліся земляныя работы па рыцьцю катлавана для будынку Дзяржаўнай Бібліятэкі. Паводле пляну сёлета павінен быць скончан фундамант і цокальны паверх. „Торгстрой" прымае меры да забясьпечаньня пабудовы цэглай і тады будзе магчымасьць яшчэ сёлета скончыць учарне будынак бібліятэкі.

На ўсіх будаўнічых работах зараз занята звыш 1200 рабочых, недахопу ў матар'ялах не адчуваецца.

Такім чынам наш Дзяржаўны Унівэрсытэт яшчэ ў гэтым годзе зможа разгарнуць заняткі ў 4-х новых карпусох.

ШКОЛЫ ЗАСТАЮЦЦА БЕЗ АПАЛУ І БЕЗ РАМОНТУ

(Рагачоўоні р., Бабруйскай арк.).

Прышоў час рамантаваць школьныя будынкі, кватэры, абсталяваньне школ, а для ўсяго гэтага патрэбны грошы. Але наш РВК вельмі находчывы: ён піша загачык школу паперку такога зьместу: „Прапануецца Вам адшукаць сродкі на месцы і адрамантаваць школу, пабяліць і інш.; калі спэцыяльных сродак нямя, дык возьміце з самаабкладаньня". А калі настаўнікі зьвярнуліся да ўпаўнаважаных па самаабкладаньню, дык адказ атрымалі такі „Мы грошы сабралі на пажарную машыну, ну значыць і не дадзім".

Яшчэ горш справа абстаіць з апалам для школ. Напрыклад: для В. Крушынаўскай школы патрэбна 80 кб. м. апалу, а атрымала школа ўсяго 15 км., значыць не хапае 65 кб. м РВК, убачыўшы такое становішча, піша сельсавету паперку, каб купілі апал за сродкі самаабкладаньня. Калі-ж паставілі гэта пытаньне на сялянскім сходзе, дык сяляне адмовіліся пусьціць грошы на апал, бо сродкі самаабкладаньня сабраны на пажарную машыну, а дабавіць яшчэ некалькі процантаў з сумы падатку сялянства адмовілася. Такім чынам В. Крушынаўская школа засталася да навучальнага году без апалу і застаецца без рамонту, без абсталяваньня. Усё гэта пагражае зрывам навучальнага году. Такое становішча ня толькі ў аднэй школе, але і ў многіх іншых.

Я. Крушына.

Падача заяў у ВНУ павялічылася.

Нам. Наркому Асьветы тав. Слонім у гутарцы з нашым супрацоўнікам зазначыў, што за апошнія часы значна павялічыўся прыток заяў у ВНУ. На 5 жніўня па дадзена ў паўтары разы больш заяў, чым ёсьць мясцоў. У сувязі з тым, што прыём заяў у ВНУ адтэрмінаван да 25 жніўня, трэба разьлічваць, што пры такім-жа тэмпе разьвіцьця кампаніі па вярбоўцы мы зможам забясьпечыць укамплектаваньне нашых ВНУ, як з боку сацыяльнага складу, так і акадэмічнай падрыхтаванасьці — здавальняюча.

У тых тэхнікумах, у якіх 5 жніўня пачаліся іспыты, прыём скончыцца да 15 жніўня. Іспыты праходзяць нармальна і мы таксама зможам правільна ўкамплектаваць гэтыя навучальныя ўстановы.

Па іншых тэхнікумах, у якіх прыём заяў адтэрмінаван да 20 жніўня, хоць прыток заяў і досыць нармальны, але ў адносінах сацыяльнага складу, галоўным чынам, за рахунак рабочых, яшчэ недастатковы. Асабліва адстаюць у гэтым напрамку правінцыяльныя тэхнікумы: Рэчыцкі, Мазырскі, Лепельскі, Барысаўскі і Амсьціслаўскі, у якіх лік пададзеных заяў ад рабочых выражаецца адзінкамі. Адстаюць у гэтым напрамку і нацыянальныя тэхнікумы: польскі і менскі яўрэйскі пэдтэхнікум. Усё-ж трэба адзначыць, што ў пэдтэхнікумы пададзена заяў ад рабочых у сярэднім 12 проц. ад агульнага ліку заяў. Адтэрміноўка падачы заяў павінна будзе павялічыць прыток апошніх за рахунак ліпка рабочых у тэхнікумах, у якіх прыём заканчваецца 15 жніўня.

Побач з гэтым Наркамасьветы ў парадку ўнутранага рэгуляваньня ўдасца кадры рабочых разьмяркаваць паміж асобнымі навучальнымі ўстановамі больш-менш раўнамерна.

На пэдагагічныя курсы прыток заяў пакуль-што слабы. Тлумачыцца гэта тым, што паступаючыя ў першую чаргу ідуць у пэдагагічныя тэхнікумы. Курсы-ж будуць існаваць амаль пры ўсіх пэдтэхнікумах і пасьля ўкамплектаваньня апошніх будуць таксама ўкамплектаваны і пэдагагічныя курсы.

Вельмі слабы вучастак прыёму гэтага году—гэта надавычайна нізкі процант заяў ад членаў калгасаў.

З станоўчых момантаў трэба адзначыць тое, што сёлета зусім невялікі процант заяў у ВНУ ад «іншых».

З 1500 заяў у ВНУ гэтай катэгорыяй паступаючых пададзена толькі 50-60 заяў.

У сувязі з тым, што Наркамасьветы прыём у навучальныя ўстановы адтэрмінаваў, наша грамадзкасьць не павінна супакойвацца. Трэба яшчэ шырэй разьвіць кампанію на ўцягненьню працоўнай моладзі ў ВНУ.

Пытаньне з інтэрнатамі ў Менску працягвае заставацца вельмі вострым. Гарадзкі савет адмовіўся даць якіянебудзь памяшканьні і па яго думцы выходзіць, што нам ня толькі трэба што даць, а яшчэ неабходна забраць ліпак плошчы з навучальных устаноў. Наркамасьветы пытаньне аб інтэрнатах перанёс у кіруючыя органы ў парадку абскарджаньня, каб прымусіць гарсавет вырашыць пытаньне аб інтэрнатах у станоўчым сэнсе, бо ад гэтага будзе залежыць нармальны ход навучальнага году.

З умоў, якія накалькі палегчаць становішча студэнцтва, трэба адзначыць некаторы рост стыпэндый: па лініі тэхнікумаў колькасьць стыпэндый мяркуецца павялічыць да 55 проц. усіх вучняў, па індустрыяльных—да 65 проц. Павялічваецца прыблізна на 10 проц. і сам разьмер стыпэндый. Наркамасьветы мяркуе для тых стыпэндыянтаў, якія ня будуць забясьпечаны інтэрнатамі, выдаваць штомесяц каля 2-х рублёў кватэрных грошай

Настаўнікі павінны дапамагчы.

(Сьмілавіцкі р., Менскай акр.).

У хуткім часе ў школах пачынаюцца заняткі. Настаўніцтва яшчэ не раскачалася, каб павесьці растлумачальную кампанію сярод дзяцей беднаты, якія заняты працай на кулацкіх гаспадарках і ня ведаюць, як у свой час пачаць разам з усімі дзяцьмі вучыцца.

У Рудзенскім сельсавеце ёсьць шмат беднякоў, якія летась скончылі чатырохгодкі, а сёлета і ня думаюць нікуды падаваць заявы, бо мала хто з іх ведае, куды падаваць заяву. А настаўніцтва і не падумала даць ім параду.

Напрыклад, у вёсцы Раўнапольле бяднячка-сірата сёлета скончыла Рудзенскую чатырохгодку, зараз сядзіць і ня ведае што рабіць.

Настаўніцтву трэба шырока павесьці растлумачальную працу сярод вясковых дзяцей, каб кожны з іх ведаў, што трэба зрабіць і як, каб можна было нармальна вучыцца.

Люд. М.

Школа за сродкі самаабкладаньня.

(Суслаўскі сельсавет, Дрыбінскага райёну, Аршанскай акругі).

Дзьве вёскі, Заложжа і Засулкі, па правадзімай кампаніі самаабкладаньня пастанавілі пабудаваць школу на сродкі самаабкладаньня.

Усяго самаабкладаньня налічана на гэтых дзьвюх вёсках 500 руб.

За гэтыя сродкі школу не пабудуеш. Але калі быў куплен будынак, дык настрой сялянства яшчэ больш узьняўся. На аб'яднаным сходзе абедзьвюх вёсак вынесена пастанова аб дадатковым самаабкладаньні ў разьмеры 25 проц. падатку.

Сяляне ўзялі на сябе адказнасьць за дастаўку матар'ялаў, патрэбных для пабудовы і грузу. Школу мяркуюць закончыць да пачатку навучальнага году.

А. Казлоў.

Н. БЯЛІНА-ПАДГАЕЦКІ.

ТАК, ПАНОЧКУ...

(Апавяданьне).

Піянэры Беларусі ў гэтыя жнівеньскія дні спраўляюць сваё дзіцячае сьвята, падсумоўваюць вынікі сваіх дасягненьняў, адзначаючы свае недахопы.

Як-жа жывуць дзеці рабочых капіталістычных і калёніяльных краін, як выхоўваюцца яны, сярод якіх інтарэсаў праходзіць іх маленькае ў большасьці выпадкаў сумнае жыцьцё?

У дні Усебеларускага піянэрскага зьлёту будзе ня лішне кінуць узрок і на капіталістычны Захад, будзе ня лішнім падумаць і аб іншых дзецях—нашых братоў па клясе.

І мне ўспамянулася...

* * *

... Ён прыехаў да нас на фабрыку ў горад Сомэн на поўнач Францыі з апошняю партыяю алжырскіх рабочых. Звалі яго Магамэд-Эль-Абдалла,

Маленькі быў гэта чалавек, худы, зморны, забіты. Ён усё больш хаваўся за сьпіны сваіх рослых таварышоў, быццам баючыся, што яго ня прымуць на работу, стараючыся прасунуцца незаўважаным у вялікую масьць нашай брыкетнай фабрыкі.

— А гэта што яшчэ за малпа?—спытаў старшы майстар, заўважыўшы нарэшце, Магамэда, які схаваўся ў кутку. Табе колькі гадоў сідзі*).

— Мне... шаснаццаць, заікаючыся ад спалоху адказаў майстру на сваёй ламаной французкай мове Магамэд.

Тут ён ужо напэўна пакрывіў душой, бо наўрад ці яму было больш дванаццаці. Але сказаць праўду колькі яму год ён баяўся, бо выбар рабочае сілы быў у гэты дзень вялікі і яго магчы-б ня прыняць на работу.

А гэта азначала-б ня толькі жабрацтва, голад і холад, да чаго Магамэд быў з малалецтва прызвычаен, але і немагчымасьць дапамагаць сваёй старой матцы і маленькім сёстрам, якіх ён пакінуў там далёка за сінім Міжземным морам, у залітым гарачым сонцам Алжыры.

— Шаснаццаць год! зарагатаў на ўсю кантору старшы майстар.

Не, вы толькі паглядзіце на гэтага парсючка—яму шаснаццаць год! Ды ты і мяшка з цэмэнтам падняць ня зможаш!

—Не, паночку, я магу працаваць... усё магу рабіць, з маленьнем у вачох сказаў Магамэд-Эль-Абдала.

—І цэмэнт магу цягаць, і зямлю рыць... Я маю сілу...

І ён дарэмна стараўся выгнуць свае слабыя грудзі, каб лепш падабацца сваім напімацелям. Але гэта яму ніяк не ўдавалася.

— Ну, добра, заставайся!—махнуў рукой старшы майстар, які ў гэты дзень быў у добрым настроі.

— Толькі глядзі ў мяне, тут-жа грозна дадаў ён. Працаваць як сьлед і ня жаліцца... А то зараз-жа выганю за вароты!

— Так, паночку!—пакорліва адказаў яму Магамэд-Эль-Абдалла.

Магамэта залічылі ў групу рабочых, па разгрузцы цэмэнту і іншых матар'ялаў для будуемай новай фабрыкі.

І хоць працаваць ён павінен быў так як і іншыя—усё-ж зарплату яму назначылі амаль у два разы меншую за тую, якую атрымлівалі яго таварышы.

— Хопіць з яго і гэтага заўважыў майстар. Усё роўна з міласьці трымаем.

І ён грозна пакрыківаў.

— Эй, «сідзі», ты чаго там не працуеш? Я табе!

— Так, паночку! з нязьменнай пакорлівасьцю адказваў Магамэд-Эль-Абдалла.

І сьціснуўшы зубы, ён цягнуў на сваёй сьпіне двухпудовы мяшок з цэмэнтам, задыхаючыся ад надмернага напружаньня сіл.

* * *

Дзесятнік—непасрэднае начальства Магамэда—быў чалавекам ад прыроды злосным і сварлівым. Пан Мажыно амаль усё свае жыцьцё правёў у далёка адлегалых французскіх калёніях—спачатку салдатам чужаземнага легіёну, потым у якасьці сэржанта аднаго з „чорных" палкоў французкай калёніяльнай арміі.

Практычныя мэтады выхаваньня—бізун і лаянкі, маючыя гэткае шырокае права грамадзянства ў французскіх (і ня толькі ў адных французскіх) калёніях мусье Мажыно перанёс і на кантынэнт, калі насьля скончэньня службы ў арміі ён паступіў у якасьці дзесятніка на брыкетную фабрыку ў Самэне.

Рабочыя—галоўным чынам выхадцы з Алжыру і Тунісу, якімі ён камандаваў па ўсіх правілах вайсковага мастацтва, баяліся свайго грознага дзесятніка больш агня.

— Гэтымі брудными сьвіньнямі можна камандаваць толькі пры дапамозе добрай дубінкі,—казаў ён ня раз сваім супрацоўнікам. Іншых адносін яны не разумеюць.

Начальства, відаць, нічога ня мела супроць такога досыць нязвычайнага для кантынэнту спосабу камандваньня рабочымі і пакрывала сваім аўтарытэтам мусье Мажыно, бо рабочыя яго выбіваліся з сіл, за нізкую плату выконваючы значна цяжэйшыя работы, чымся іх лепш аплачваемыя „белыя" таварышы па працы — французы. А дырэкцыі брыкетнае фабрыкі гэтага толькі і трэба было.

І з раніцы да вечара рычаў па вялікай фабрыцы голас пана Мажыно, наганяючы жах на адных, напаўняючай клясавай нянавісьцю сэрцы другіх.

Асабліва з першага-ж дню працы ўзьненавідзеў мусье Мажыно свайго новага рабочага—слабога і маленькага Магамэда-Эль-Абдалла.

— Чакай-жа, я пакажу табе як дарэмна французскі хлеб ёсьці „сідзі" праклятыя! з вялікай нянавісьцю гаварыў мусье Мажыно Магамэду. Ты ў мяне напрацуешся, будзь спакойны!

— Так, паночку! адказаў яму на гэта Магамэд.

— Ну, чаго глядзіш праклятая сабака?!—не супакойваўся мусье Мажыно. Марш на працу! Ды хутка!..

— Так, паночку!

І Магамэд кідаўся з усіх ног выконваць іншы раз самыя бязсэнсныя, самыя незаконныя загады свайго ката.

Ён быў гатовы на ўсё. Толькі дайце магчымасьць хоць што-небудзь зарабляць, толькі дайце магчымасьць хоць што-небудзь пасылаць сваёй сям'і, якая галадала ў залітым паўднёвым сонцам Алжыры.

* * *

Даканаў такі нарэшце мусье Мажыно маленькага алжырца Магамэда-Эль-Абдалла.

Быў атрыман загад паслаць аднаго з алжырцаў пачысьціць ватэр у памяшканьні дырэктара.

Работа, зразумела, брудная і нярпрыемная. Жадаючых на яе вельмі мала.

Але мусье Мажыно ня любіць доўга гаварыць.

— Ты пойдзеш!—махнуў ён галавой у бок Магамэда і павярнуўся аддаваць другія загады, лічачы справу вырашанай.

Не, мусье Мажыно, я не пайду. Закон мне забараняе чысьціць ватэр.[1])

Пасылайце мяне куды хочаце, але гэту работу я рабіць ня буду.

Гэта сказаў маленькі Магамэд. Той самы Магамэт, які да гэтага часу пакорліва выконваў усе загады, які цярпеў усе зьдзекі...

— Што...о...?!

Зьдзіўлена глядзіць Мажыно на Магамэда. Як адважыўся ён—брудны сідзі—пярэчыць яму, былому сэржанту французкай калёніяльнай арміі! Не, якое нахальства!

Са сьціснутымі кулакамі, з наліты-мі крывёю вачыма падступае Мажыно да маленькага Магамэда. Лютаю злосьцю гучыць яго хрыплы з перапою голас.

— Пярэчыць шчанё! Ідзі чысьці ватэр!

— Я... не... магу... запінаючыся шэпча маленькі алжырац, я... не... магу!..

— Маеш-жа сабака!

Цяжкі фэльдфэбэльскі кулак лёг на галаву дванаццацігадовага хлапчука.

Магамэд глуха охнуў і падае на зямлю страціўшы прытомнасьць.

* * *

Можа і гэта мастацтва прайшло-б пану Мажыно, калі-б у справу аб зьбіваньні маленькага алжырца не ўмяшалася мясцовая паўлегальная партыйная ячэйка.

Сэкратар яе стары рабочы Жырард паведаў Магамэда ў яго брудным сьмярдзючым бараку, які быў прадастаўлен багатаю вугальнаю кампаніяю пад памяшканьне сваім рабочым з Алжыру і Тунісу.

— Цябе прыдуць дапытываць з паліцэйскага вучастку,—гаварыў Жырард Магамэду.—Ня бойся, кажы ўсю праўду. Мы цябе падтрымаем.

— Добра, паночку, адказаў яму на гэта маленькі алжырац.

— Не пан, а таварыш, з усьмешкай паправіў яго Жырард

І дадаў:

— Трэба добра навучыць гэтага лайдака Мажыно. Вось як дружа: усе за аднаго і адзін за ўсіх!

Доўга глядзеў Магамэд усьлед выходзячаму з барака старому Жырарду. Ніколі яшчэ ніхто з французаў з гэткаю прыязьню не гаварыў з ім.

— Усе за аднаго, адзін за ўсіх!—шантаў ён, успамінаючы сваю гутарку з камуністам. Значыцца Мажыно не такі ўжо недасяжны, значыцца і на яго, пры дапамозе гэтых добрых таварышоў-рабочых, можна будзе знайсьці управу!

* * *

Справа аб зьбіваньні дзесятнікам Мажыно маленькага алжырца дзякуючы стараньням партыйцаў фабрыкі зрабілася вядома шырокім масам.

Аб ёй пісалася ў мясцовай камуністычнай прэсе, аб ёй гаварылі рабочыя на вытворчасьці, у таварнях, у рэстаранах.

Замяць гэту нярпрыемную ва ўсіх адносінах справу ня было больш магчымасьці. І дырэкцыя фабрыкі, з болем сэрца, дала нарэшце сва

НА ДАПАМОГУ КАМСАМОЛУ

ў справе камуністычнага выхаваньня дзяцей

ЧАГО МЫ ПАТРАБУЕМ?

Ад Нар. Каміс. Аховы Здароўя.

Мы просім:

1. Узяць на сябе абавязак кіраваць мэдыцынскай, гігіенічнай часткай зьлёту піанэраў.

2. Зрабіць справаздачу перад грамадзкасьцю аб праробленай аздаравіцельнай працы сярод піанэраў і дзяцей.

3. Скласьці 5-х гадовы плян аздаравіцельнай працы сярод піанэраў і дзяцей (адчыненьне лягероў, санаторый-калёній, аздаравіцельных пляцовак і г. д.).

4. Арганізаваць аздаравіцельную выстаўку на Усебеларускім зьлёце піанэраў.

5. Праверыць абслугоўваньне дактарамі-шэфамі і дактарамі АЗДП піанэратрадаў і лягэраў, а таксама ўвесьці спэцыяльных дактароў для абслугоўваньня піанэрарганізацыі ў буйных акруговых цэнтрах.

Ад рабочай каапэрацыі

Мы просім:

1. Абгаварыць пытаньне аб арганізацыі спэцыяльных дзіцячых сталовак у акруговых цэнтрах.

2. Узяць на сябе абавязак арганізацыі харчаваньня для ўдзельнікаў Усебеларускага зьлёту.

3. Абгаварыць пытаньне аб дапамозе ў арганізацыі бытавых патрэб піанэраў і дзяцей:

а) арганізацыі піанэрска-школьных магазынаў, дзе канцэнтраваць продаж школьных прыладаў, адзежы і абутку для дзяцей і г. д.

б) арганізацыі школьных каапэратываў,

в) удзел у арганізацыі і правядзеньні лягэраў піанэраў.

Ад Белкаапсаюзу.

1. Устанавіць шэфства ўсіх каапэрацыйных арганізацый над піанэрскімі атрадамі, адначасова праверыць працу тых каапэрацыйных арганізацый, якія ўзялі шэфства над піанэратрадамі, што імі зроблена ў дапамозе піанэрскай арганізацыі.

2. Узмацніць матар'яльную дапамогу піанэрскім атрадам на вёсцы, вылучаючы плянава з культ. быт, фонду каапэрацыі суму на іх патрэбы.

3. Абгаварыць пытаньне, да якіх асноўных заданьняў у каапэрацыйнай працы неабходна прыцягнуць сілы піанэрскай арганізацыі і дзяцей.

Ад Наркам'юсту.

Мы просім:

а) арганізаваць гутаркі з удзельнікамі зьлёту аб прававым становішчы дзяцей.

б) на сэкцыі ўсебеларускага зьлёту па пытаньню аховы працы і правоў дзяцей арганізаваць выступленьне прадстаўніка НКЮ аб прававым становішчы дзяцей.

в) арганізаваць справачнае бюро па пытаньнях прававога становішча дзяцей.

Ад Менскага Акруговага інспэктарыята Нарасьветы ЦП Саюзу Працасьветы.

1, Узяць на сябе абавязак пэдагагічнага абслугоўваньня зьлёту дзеля чаго прыцягнуць настаўнікаў-выканацеляў для прымацаваньня іх да вызначанай групы рабочых кватэр, дзе будуць разьмешчаны дэлегаты для пэдагагічнага нагляду.

2. Вылучыць групу настаўнікаў для ўдзелу у канфэрэнцыі зьлёту для прымацаваньня да сталовак, тэатру і інш. месц дзе будзе адбывацца праца ўсебеларускага зьлёту.

3. Вылучыць групу настаўнікаў, якой даручыць заняцца дасьледчай работай у час усяго зьлёту.

Ад Менскага гарсавету.

Мы просім:

1. Дастасаваць да Усебеларускага зьлёту піанэраў выкананьне прапаноў, якія былі высунуты менскімі піанэрамі ў дзіцячых наказах у часе перавыбараў Гарадзкога Савету.

2. Прыняць меры да ўпрыгожаньня рабочых клюбаў, садоў, тэатраў, устаноў, прадпрыёмстваў, вуліц сьцягамі, лёзунгамі, плякатамі, прысьвечанымі зьлёту.

3. Мабілізаваць машыны, аўтабусы для абслугоўваньня дэлегатаў Усебеларускага зьлёту.

4. Прыняць актыўны ўдзел у разьмяшчэньні дэлегатаў Усебеларускага зьлёту па кватэрах рабочых.

5. Забясьпечыць працу Усебеларускага зьлёту неабходнымі памяшканьнямі, клюбамі, пляцоўкамі.

6. Забясьпечыць санітарным наглядам месца, дзе будуць знаходзіцца і працаваць піанэры ў часе Усебеларускага зьлёту.

Да ЦСПСБ, Цэнтральнага Праўленьня працаўнікоў зямлі і лесу, налегіі Наркампрацы.

Мы просім.

1. Унесьці ў Савнарком канкрэтныя прапановы аб дадатках і ўдакладненьнях законаў аб працы малалетніх.

2. Выступіць на канфэрэнцыі Усебеларускага зьлёту з кароткім дакладам аб становішчы малалетніх с-гасп. рабочых, батрачат, і як захоўваюцца іх правы і інтарэсы.

3. Прыняць меры, каб усе батрачаты, якія вылучаны на зьлёт, былі забясьпечаны зарплатай за час зьлёту, а таксама ня страцілі працы з прычыны зьлёту.

4. Зрабіць справаздачу перад грамадзкасьцю аб тым, што зроблена ў галіне аховы праў і працы малалетніх батрачат.

5. У беларускай газэце „Батрак" сыстэматычна высьвятляць становішча батрачат, работу КСМ і піанэрскай арганізацыі сярод батрачат.

6. Скласьці 5-цігадовы плян, які павінен прадугледзець шэраг асноўных мерапрыёмстваў па барацьбе з парушэньнямі савецкага заканадаўства аб дзіцячай працы.

7. Піанэрорганізацыя бярэ на сябе абавязак разгарнуць шырокую працу з дзецьмі, якія працуюць па найму (ад 12 да 14 гадоў). У гэтай працы нам патрэбна дапамога прафэсыянальных і дзяржаўных арганізацый, у прыватнасьці неабходна:

а) выдаць часовую інструкцыю, якая ахоўвала-б працу дзяцей ад 12 да 14 год;

б) прыцягнуць піанэрскіх і камсамольскіх працаўнікоў у якасьці пазаштатных інспэктароў працы, загадзя іх праінструкціраваўшы;

в) абавязаць усе арганізацыі, асабліва сельрабачкомы весьці вучот працуючых па найму дзяцей і сыстэматычна арганізоўваць разам з атрадамі і ячэйкамі КСМ сходы гэтых дзяцей;

г) утварыць пры прафсаюзах і пры школах фонды дапамогі малалетнім, працуючым па найму;

д) утвараць асобныя вячэрнія школы і групы для працуючых па найму (пастушкоў, дзяцей працуючых у саматужнікаў);

е) абавязаць усіх гаспадароў даць дзецям магчымасьць вучыцца ў школе;

ж) арганізаваць матар'яльную дапамогу (забясьпечаньне абуткам, вучэбнымі падручнікамі і г. д.).

8. Тэрмінова падлічыць у саматужных мясцовасьцях усіх дзяцей, якія заняты ў вытворчасьці. Распрацаваць пытаньне культасьветнай працы сярод іх. Там, дзе нельга вучыць іх у школах, дабіцца ўвядзеньня індывідуальна-групавога навучаньня. Дабіцца павялічэньня сеткі інспэктароў па ахове працы.

9. Арганізаваць у часе Усебеларускага зьлёту гутаркі з дэлегатамі аб эканамічным становішчы батрачат, і дзяцей, працуючых у саматужнай прамысловасьці.

Камітэт садзейнічаньня Ўсебеларускаму зьлёту піанэраў.

Вык. абавязкі Старшыні камітэту ІГНАТОЎСКІ.

Нам. Старшыні ЦБЮП пры ЦК ЛКСМБ РЫВІН.

(КАНЕЦ).

Безгаспадарчасьць у нашай прамысловасьці.

Кожны год, калі даводзіцца разглядаць балянсы прамысловых трэстаў, натыкаемся на лічбы як па няпэўных даўгох, так і лішку і недахопу матар'ялаў і тавараў. Гэтыя сумы кідаюцца ў вочы, а між іншым на іх мала зьвяртаюць увагі ня толькі самі трэсты, але і ВСНГ.

Перш-на-перш аб няпэўных і безнадзейных даўгох. Што сабой прадстаўляюць няпэўныя даўгі? Гэта тыя сумы, якія ўзяты ў прамысловасьці тымі ці іншымі асобамі ўнутры самога прадпрыёмства з таго ці іншага поваду (авансы, крэдыты і г. д.) і ня зьвернуты своечасова прадпрыёмствам. Гэта, галоўным чынам, ёсьць таксама і сумы завінавачанасьці прадпрыёмствам прадпрыёмству, дзякуючы недасканалым разрахункам паміж імі.

На 1-га кастрычніка 1928 году гэтыя даўгі і запазычанасьці па ўсіх прадпрыёмствах складалі суму ў 645.384 рублі.

Што-ж робяць трэсты да таго, каб у канцы-канцоў спагнаць усе гэтыя даўгі і каб указаныя сумы былі зьвернуты на патрэбу прамысловасьці? Амаль што нічога. Калі прыходзіцца гутарыць з тым ці іншым прадстаўніком трэсту наконт таго: „Што-ж вамі робіцца для спагнаньня даўгоў", дык адны адказваюць, што прымаюць крокі для спагнаньня, а другія, што „мы лічым даўгі безнадзейнымі і чакаем даўнасьці. каб іх сьпісаць на ўбытак". Сапраўды, яно так і ёсьць: ёсьць сумы даўгоў з 1923 году, і па іх нават ніякая перапіска па спагнаньні не заведзена. Прыклад: пры праверцы рэальнасьці даўгоў па швэйтрэсту можна было ўбачыць, што па Меншвэю цягнуцца даўгі яшчэ з 1923 году, прычым, за паасобнымі асобамі лічацца завінавачанасьці да 6.000 руб., яны працуюць і цяпер. Ёсьць адзнакі дырэкцыі трэсту, што гэта вышла дзякуючы недакладным актам перавучоту. Паўстае пытаньне! як-жа маглі складацца такія акты? Ёсьць і другія адзнакі дырэкцыі трэсту: „Адмаўляецца плаціць", або „месца знаходжаньня не вядома" Такое-ж зьявішча і па іншых трэстах.

Такія прыклады сьведчаць аб тым, што бяз прыняцьця адпаведных крокаў па спагнаньні завінавачанасьці нельга будзе дабіцца таго, каб па балянсах не красаваліся такія вялікія сумы дзяржаўных сродкаў, якімі карыстаюцца паасобныя грамадзяне. Трэба ўстанавіць адказнасьць дырэкцыі за тое, што звальняючы таго ці іншага супрацоўніка ці рабочага, якія ўзялі сродкі, яны ня робяць поўнага разьліку са зволеным, а калі няма з чаго ўтрымаць, дык трэба рабіць адзнакі ў дакумэнтах, што за ім лічыцца доўг у такой-та суме, дзеля таго, каб пры паступленьні на службу тая ўстанова, дзе ён будзе працаваць, магла ўтрымаць і пераслаць. Гэтым самым можна будзе зьнішчыць перапіску па спагнаньні запазычанасьці.

Ня менш цікавыя лічбы можна паказаць і ў адносінах лішку і недахопаў матар'ялаў і тавараў.

Кожны год мы ўсё больш і больш удасканаліваем нашу справаздачнасьць, але-ж калі паглядзець на лічбы лішак і недахопаў, дык падумаеш, як-жа там, дзе вядзецца дасканалая бухгальтэрыя, ёсьць на такую вялікую суму лішкаў і недахопаў матар'ялаў і тавараў.

Галоўбухі на гэта проста адказваюць і не палохаюцца зусім, калі недахоп менш лішку, абы толькі ня было наадварот. Калі на 1-е кастрычніка 1928 г. ёсьць на 805.753 р. лішак і на 532.061 руб. недахопаў, дык сальдо 273.692 руб. вельмі няпэўнае. Такое-ж амаль становішча і на I-X—26 г. і на I-X—27 г. Калі разглядаючы баланс таго ці іншага прадпрыёмства, ставіш пытаньне, чаму такія вялікія лішкі і недахопы, дык амаль адзін і той-жа адказ: „Маланісьменны кладаўшчык—вылучэнец, ня можа ўправіцца і заўсёды блытае назву матар'ялаў і блытае справаздачнасьць". На гэта трэба адказаць, што звальваць з хворай галавы на здаровую—гэта ня ёсьць спосаб, а гэта трэба аднесьці да злоснага бюракратызму, безгаспадарчасьці і бязвучотнасьці. Ня можа быць і не павінна быць на сотні тысяч недахопаў матар'ялаў і тавараў у тым ці іншым трэсце ў той час, калі мы вылічваем кожную капейку, каб яна была скарыстана па прызначэньню, а калі гэта ёсьць, дык за гэта трэба прыцягваць вінавайцаў да адказнасьці.

Па маёй думцы, на гэтыя лішкі і недахопы матар'ялаў і тавараў, а таксама няпэўныя і безнадзейныя даўгі, якія значна зьмяншаюць прыбытак па балянсах, трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на самых прадпрыёмствах з боку вытвоўчых нарад рабочых.

Трэба, каб дырэкцыя трэсту у сваёй справаздачнасьці перад рабочымі прадпрыёмства гэта пытаньне ставала на абгаварэньне. Толькі такім спосабам мы можам быць упэўнены, што гэтыя недахопы будуць зьнішчаны, і прыбытак па прадпрыёмствах значна ўзрасьце.

БАР.

Сяляне--бязбожнікі.

(Самахвалавіцкі райён, Менскай округі).

Ячэйка Саюзу Бязбожнікаў пры Крупіцкім сельсавеце ўтварылася ў канцы 1928 г. На 25-ае ліпеня г. г. ячэйка налічвае 56 членаў. З гэтага ліку: сялян — 20 чалавек, рабочых—10, служачых—26 чалавек.

Сталая антырэлігійная праца сярод насельніцтва Крупіцкага сельсавету пачалася ў лютым месяцы. Да гэтага часу ячэйка саюзу „Бязбожнік" паставіла ў розных вёсках сельсавету звыш 10 дакладаў на антырэлігійныя тэмы. Сяляне вёсак, дзе ставіліся даклады, з вялікай цікавасьцю слухалі даклады па антырэлігійных пытаньнях.

Сярод сялян, якія ўступілі ў саюз бязбожнікаў, ёсьць ня толькі высковая моладзь, а і старыя сяляне.

Разам з разгортваньнем прапаганды па Крупіцкаму сельсавету, ўзмацнілася і дзейнасьць рэлігійных арганізацый. Назіраюцца выпадкі, што сяляне, якія не наведвалі царквы па 8—10 год, цяпер, пад уплывам царкоўнікаў, акуратна наведваюць царкву, ходзяць да споведзі, не пасылаюць дзяцей у школу ў рэлігійныя сьвяты.

Цяпер перад саюзам бязбожнікаў стаіць чарговая задача—пашырыць і ўзмацніць тэмп антырэлігійнай прапаганды ў вёсках Крупіцкага сельсавету.

На пляну працы бюро саюзу бязбожнікаў мяркуе ў другім паўгодзьдзі 1929 г. паставіць у чатырох буйных вёсках звыш 25 дакладаў. Гэту працу крупіцкія бязбожнікі здолеюць правесьці, бо сярод членаў ячэйкі ёсьць моцны актыў дакладчыкаў, які часткова складаецца з настаўніцтва і мэдыцынскіх працаўнікоў райбольніцы.

Сяляне вельмі цікавяцца пытаньнямі прыродазнаўства і сельскай гаспадаркі, якія распрацоўваліся ў школе з іхнімі дзяцьмі.

Усе члены ячэйкі бязбожнікаў не сьвяткуюць рэлігійных сьвят; у гэтыя дні яны працуюць у полі, аруць, жнуць і г. д. Добры прыклад сваёй вёсцы даў бязбожнік **Гіполіт Гайдукевіч**, селянін вескі Стаўбуновічы; у дзень „праўкі Ільлі", калі ўся вёска сьвяткавала, ён са сваёй сям'ёй жаў цэлы дзень жыта.

Я. Барысэвіч.

ХРОНІКА.

У прэзыдыуме Менгарсавету.

Прэзыдыум Менскага гарсавету заслухаў даклад сэкцыі Нарасьветы.

Бюро сэкцыі прызнана здавальняючай.

Бюро сэкцыі прапанавана правесьці праверку падрыхтоўкі да новага навучальнага году.

Прэзыдыум завастрыў увагу на неабходнасьці забесьпячэньня школ і дзяцей беднаты падручнікамі.

* * *

Прэзыдыум гарсавету разглядзеў пытаньне аб выніках чысткі інвалідных арцеляў. Адзначана, што матар'ялы чысткі сьведчаць аб засьмечанасьці арцеляў, нездавальняючы падбор кіруючага складу, а таксама кепскую працу па камплектаваньні апошніх.

На далейшы час прапанавана прыняць усе захады да пралетарызацыі арцеляў.

Пленум Менгарсавету.

8 жніўня ўвечары ў летнім садзе „Профінтэрн" адбыўся працяг пленуму Менскага гарадзкога савету.

Працягваліся спрэчкі па пытаньню аб выніках навучальнага году. Большасьць прамоўнаў застанавіліся на неабходнасьці палепшаньня стану школ, а таксама сацыяльнага складу настаўніцтва.

Пленум па гэтаму пытаньню прыняў адпаведную рэзалюцыю, дзе вызначаецца далейшы шлях працы школ.

Дзелавая праца пленуму яшчэ працягнецца.

Сёньня адчыняецца Менская акруговая спартакіяда.

Сёньня на летняй пляцоўцы „Профінтэрн" адбудзецца адчыненьне Менскай акруговай фізкультурнай спартакіяды. Для ўдзелу зьехаліся з 14 райёнаў Меншчыны 200 фізкультурнікаў.

У праграму спаборніцтваў — лёгкая атлетыка, гульні і інш

Беларускія дэлегаты на Усесаюзную шах-шаш. канфэрэнцыю.

З 20 па 27 жніўня ў Ленінградзе склікаецца Усесаюзная рабочая шахматна-шашачная канфэрэнцыя. Адначасова з канфэрэнцыяй будуць праходзіць шахматныя спаборніцтвы.

Ад Беларусі на кафэрэнцыю выяжджаюць два дэлегаты.

200 тысяч рублёў на пабудову трамваю.

Камунбанк адпусьціў дапаўніцельна 200 тысяч рублёў на пабудову Менскага трамваю.

У сувязі з гэтым будзе сёлета пракладзена лінія—Пляц Волі—Старажоўка.

Зьлёт піанэраў — на кіноэкране.

Апэратары Белдзяржкіно будуць здымаць ход Усебеларускага зьлёту піанэраў. Кіно-хроніка будзе дэманстравацца ва ўсіх кіно-тэатрах Беларусі, а таксама ў апошні дзень зьлёту—перад яе ўдзельнікамі.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 10-га ЖНІЎНЯ 1929 г.

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	4.85,5	—
Біспроц. выйгр. паз. 26 г.	128.25	130.25
Выйгр. пазыка 1929 г.	100.95	101.35
10 проц. выйгр. пазыка 1927 г.	26.24	26.34
3-я сялянск. выйгр. паз. 1927 г.	5.00,5	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.62	10.67
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25.89	25.97
„ „ „ проц.	26.60,5	26.70,5
„ „ „ 6-проц.	25.50	25.60
II проц. дзярж. паз. 28 г.	104.83	104,88
12 проц. рэнтная пазыка 1927 г.	102.28	—

С у д.

Шкоднікі сацыялістычнага будаўнцтва.

Браты Абрам і Нохім Штэйны, зьяўляючыся ўласьнікамі 2 млыноў—паравога ў вёсцы Грычына і вадзянога ў вёсцы Грабёнка, Чэрвенскага райёну, былі варожа настроены супроць розных парачыненьняў мясцовай савецкай улады. Калі ў 1927 і 1928 гадох па Грабенскаму сельсавету праводзілася кампанія па самаабкладаньню на палянпшэньне дабрабыту вёскі,—яны з мэтай сарваць кампанію, заўсёды на млынах з завозчыкамі вялі гутарку на тэму аб самаабкладаньні, распальвалі сялян супроць мерапрыёмстваў правадзімага самаабкладаньня, падбухторвалі сялян не згаджацца і ня выносіць пастаноў аб самаабкладаньні—агітавалі і распаўсюджвалі хлусьлівыя чуткі, што савецкая ўлада ўводзе вялікія падаткі і спаганяе іх суровым рэжымам.

Асабліва Штэйны былі не здаволены тым, што Грабенскае сельска-гаспадарчае таварыства разгарнула сваю працу, бо тыя сяляне-беднякі, якіх Штэйны на працягу доўгага часу эксплёатавалі за пуд мукі на працы каля млыну па „апрацоўцы іх зямлі не законна атрыманай з паспаснага фонду, паступова забывалі Штэйнаў і з пазыкай насеньня і грошай звачаліся выключна ў сваё таварыства

Гэта вельмі непакоіла Штэйнаў. Сялянская беднота ня гнула сваёй сьпіны перад нэпманамі, вызвалілася з іх кіпцюроў. Прыбытковасьць Штэйнаў памяншалася.

Маючы сувязь з кулаком Васілём Крукам на зямлі якога стаяў млын Штэйнаў ад якіх Крук меў добры прыбытак, яны Штэйны па папярэдняй умове з Крукам павялі агітацыю супроць крэдытнага таварыства. 28 ліпеня 1928 г., калі на пасаду старшыні праўленьня таварыства быў абран сябра партыі Тарадно,—Абрам Штэйн у прыватнай гутарцы сказаў яму: „вы вельмі добры чалавек, але кепска, што камуніст". Акрамя гэтага Штэйн уганаміваў Тарардо не будаваць будынкаў для крэдытнага таварыства—бо ад сяляк падзяка будзе адна. Сумленны старшыня Тарадно праводзіў клясавую лінію, мала лічыўся Штэйнамі і на падставе пастановы праўленьня распачаў будаваць канцэлярыю і складачныя памяшканьні для таварыства—Штэйны і Крук узбударажыліся ім здавалася, што не ўдалёкім часе млын таксама пяройдзе ў веданьне таварыства і яны, склікаўшы сход заможнікаў, угаварылі частку сялян разбурыць пачатыя будавацца склады, чаго ўрэшце і дабіліся. Характэрна адзначыць, што тым сялянам, якія ня ішлі на вудачку Штэйнаў яны адмовіліся малоць збожжа, праганялі з млыну і іранічна сьмяяліся „вязіце малоць у таварыства".

За гэта злачынства Менскі акруговы суд прыгаварыў: Абрама Штэйна і Васіля Крука па тры гады зьняволеньня кожнага, Нохім Штэйна на два гады з пазбаўленьнем у правох на два гады ўсіх засуджаных. Па амністыі Крук мера сацыяльнай абароны скарочана на палову, а Штэйнам як непрацоўным амністыі не дастасавана

Д. Кастроў.

БІБЛІАГРАФІЯ.

В. Чэмелаў. Гадоўля цыбулі. Белдзяржвыдавецтва. Менск—1929 г. Стар. 59. Цана—20 кап. Тыраж—5.000 экз.

Гадоўляй цыбулі дзеля сваіх патрэб і на продаж у нас займаецца амаль ня кожная сялянская гаспадарка. Ня гледзячы, аднак на гэта, усё-ж у нас наглядаецца недахват цыбулі.

Згодна з данымі, якія прыводзіць В. Чэмелаў, „да імпэрыялістычнай (1914—1918 г.) вайны цыбуля вывозілася і з Беларусі. Паводле даных чыгуначных перавозак за 1911—13 гады, цыбулі вывезена 52 тыс. пудоў.

У 1928 г. для вывазу за межы Народны Камісарыят Гандлю БССР загатаваў 30.000 пудоў цыбулі... У 1929 годзе мяркуюць загатаваць ня менш 100.000 пудоў".. (стар. 4 брашуры В. Чэмелава).

Калі параўнаць гэтыя адрываныя даныя 4-ай старонкі з такімі-ж данымі, зьмешчанымі на старонцы 58-ай, брашуры В. Чэмелава, дык наўрад ці можна што-небудзь буззе зразумець з усяго таго, што піша В. Чэмелаў аб вывазе намі цыбулі за межы.

Вось што піша В. Чэмелаў на ст. 58:

„Вялікія нашы гарады, як Менск, Віцебск, карыстаюцца пераважна прывознай цыбуляй з Украіны. А між іншым БССР магла-б абысьціся сваёй цыбуляй ня толькі для задаваленьня патрэб мясцовых рынкаў, але і для вывазу".

Выходзіць так, што мы вывозілі і вывозім сваю цыбулю за граніцу, а ў той самы час прывозілі цыбулю з Украіны для Віцебску і Менску. Зразумела, што з слоў В. Чэмелава можна ўрэшце вытлумачыць, што мы сваю лепшую цыбулю вывозім за межы СССР, а горшую украінскую прывозім для сваіх патрэб. Аднак, для радавога чытача гэта будзе ўжо здагадкай, тлумачэньнем.

Па-другое, пішучы аб вывазе нашай цыбулі за межы, В. Чэмелаў цьвёрда не вызначае за якія межы: і гэта за межы СССР, ці за межы БССР.

Ясным, нам здаецца, з усіх няяснасьцяй брашуры В. Чэмелава застаецца толькі адно, што наша цыбуля мае добры збыт за межамі БССР і таму трэба заняцца яе ўзмоцненай гадоўляй, тым больш, што культура цыбулі ў БССР дае найбольшы прыбытак.

У той частцы брашуры, дзе гаворыцца аб спосабах гадоўлі цыбулі, мы знаходзім грунтоўнае высьвятленьне гэтага пытаньня.

Брашура за адзначанымі недахопамі, напісана на добрай і зусім зразумелай беларускай мове і ілюстравана патрэбнымі малюнкамі і табліцамі. З гэтых апошніх відаць, што культура цыбулі зьяўляецца ў нас вельмі прыбытковай справай і дае самы высокі прыбытак у параўнаньні з іншымі культурамі.

Добра-б было, каб нашы сельскія гаспадары зацікавіліся культурай цыбулі.

Цана кніжкі магла-б быць танейшая і больш даступная для селянства, бо карысьць ад іх тым меншая, чым кніжка даражэй.

П. Т.

НОВЫЯ КНІГІ.

Паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кнігі і часопісі.

1. **„Літаратура и марксизм"**, кніга 2-я. Журнал тэорыі і гісторыі літаратуры. Стар. 155, цана 1 руб. Дзяржвыдавецтва РСФСР.

2. **„Плуг" № 5.** Літаратурна-мастацкі штомесячнік. Стар. 79, цана 50 кап. Каапэрацыйнае Выданьне Т-ва Пісьменьнікаў „Плужанін".

Апавяшчэньні

У нядзелю 11-8—г. г., роўна а 10-й гадз. раніцы ў памяшканьні ЦП саюзу працасьветы адбудзецца нарада сэкратароў групкомаў і мясцкомаў саюзу працасьветы гор. Менску.

Дзякуючы важнасьці пытаньняў, падлягаючых абгаварэньню на нарадзе,—яўка сакратароў групкомаў і МК, або іх намесьнікаў—абавязкова і без спазьненьня.

Менскі акр. інспэктарыят Нарасьветы ставіць у вядомасьць, што прыём у дзіцячыя сады і ачагі будзе праводзіцца з 15 да 25 жніўня. Заявы трэба падаваць непасрэдна ў адпаведныя сады і ачагі.

— Даводзіцца да ведама ўстаноў і ўсёй грамадзкасьці, што Беларуская Акадэмія Навук перамесьцілася з 3-га жніўня г. г. у новае памяшканьне,—быўшы інтэрнат БДУ—вуг. Ленінскай і Універсытэцкай, № 29-35.

Часова выкон. абавязкі адказнага рэдактара П. ШАСТАКОЎ.

ТЭАТР—КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.
ГАСТРОЛІ МУЗЫЧНАЙ КАМЭДЫІ
Субота 10-га жніўня
„БАЯДЕРКА" у 3-х дзеях КАЛЬМАНА.
ПАЧАТАК А 9-Й ГАДЗІНЕ.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА" — 3 аўторка, 6 жніўня „ХАБУ" Кіно-аповесьць у 6 частках. Пачатак а 8 гадз.

КІНО-САД «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» Савецкая № 71. — 3 аўторка, 6 жніўня. Новы мастацкі —) фільм (— „ЛЕСЯ". Штодня 2 сэансы, пачатак: 1-га—9 г. 15 х. 2-га—10 г. 45 х. Каса а 7 гадз.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». — З прычыны вялікага посьпеху яшчэ 3 дні 9, 10 і 11 жніўня. Грандыёзны мастацкі баявік „ТАНКРЭД І КЛЕРЫНДА"

КІНО ПРАЛЕТАРЫ — „СУПРАЦІЎНІЦЫ" Бытавая драма ў 7 частках. пачатак а 7 з палов. гадз., каса а 6 г.

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
АБВЯШЧАЕ ТЭМЫ НА НАВУКОВА-ПАПУЛЯРНЫЯ МАСАВЫЯ КНІЖКІ.
1. СЭРЫЯ
„Жывая і няжывая прырода"
А) „ЯКІМІ КАРЫСНЫМІ ВЫКАПНЯМІ БАГАТА БССР"
Б) „ФЛЁРА І ФАУНА БЕЛАРУСКІХ БАЛОТ".
В) „ФАЎНА ВОДНЫХ БАСЭЙНАЎ БССР".
Г) „ВОРАГІ І ПРЫЯЦЕЛІ ЧАЛАВЕКА З НЯБАЧНАГА СЬВЕТУ".
Д) „ЯК РАСЬЛІНЫ ЗМАГАЮЦЦА ЗА СВАЁ ЖЫЦЬЦЁ".
Е) „ГРЫБЫ-ЧУЖАЕДЫ, ІХ ШКОДА ДЛЯ С.-ГАСП. І ЗМАГАНЬНЕ З ІМІ".
Ж) „ЖЫВЁЛЫ-ПРЫЯЦЕЛІ СЕЛЬСКАЕ ГАСПАДАРКІ".
З) „ЖЫВЁЛЫ-ШКОДНІКІ СЕЛЬСКАЕ ГАСПАДАРКІ".
І) „ФЛЁРА І ФАУНА МОРА".
К) „ПАХАДЖЭНЬНЕ ЖЫЦЬЦЯ НА ЗЯМЛІ".
УМОВЫ:
1. Ганарар 80 рублёў за аркуш (40000 друк. знакаў),
2. Апошні тэрмін здачы рукапісу не пазьней 1 лістапада г. г.
3. Памер кніжкі ня болей 3 аркушоў.
4. Зьмест павінен быць разьлічаны на масавага чытача.
5. Да рукапіса дадаць ілюстрацыі, або сьпіс з паказаньнем адкуль можна ўзяць кожную ілюстрацыю (аўтар, назва кнігі, год выданьня і № старонкі).
Заявы на атрыманьне заказу ад БДВ прысылаць разам з кароткім зьместам будучага рукапісу.
Заявы прымаюць асабіста, па тэлефону і пісьмова (з іншых гарадоў).
Апошні тэрмін падачы заяў 20 жніўня г. г.
АДРАС ДЛЯ ЗАЯЎ І ДАВЕДАК: Менск, Савецкая 63, Белдзяржвыдавецтва, тэлефон 5-97.

НАРКАМГАНДЛЮ БССР ПАВЕДАМЛЯЕ

да агульнага ведама,

што ім з 8 жніўня 1929 г. унесен у другі разьдзел гандлёвага рэестру СССР (па БССР) пад № 39 трэст пад назвай Беларускі Дзяржаўны Трэст прамысловасьці мінэральных будаўнічых матар'ялаў

„БЕЛДЗЯРЖСТРОМТРЭСТ".

Статут паказанага трэсту зацьверджан прэзыдыумам ВСНГБ 6-га ліпеня 1929 году.

Мейсца знаходжаньня кіраўніцтва ў г. Менску. Межы дзейнасьці—вытворчасьць і збыт цэмэнту, цэглы, вапны, кахлі, мінэральных фарбаў і інш. будаўнічых матар'ялаў мінэральнага паходжаньня.

Статутны капітал вызначан арыёнтыровачна—1.500.000. руб.

Сакратар Наркамгандлю БССР ПАПЛАЎСКІ.

ПАПРАЎКА.

Да абвесткі Наркамасьветы „ПЭДФАК НА ДАМУ", надрукаванай у нумары 170 ад 28 ліпеня г. г.

«Асобы якія скончылі пэдтэхнікумы, таксама прымаюцца на 1-ы курс».

ЗГУБЛЕНЫ:

— Вучотна-конская кніжка № 322 Мазо Ш., кв. 481п.

Кніжка дапрызыўніка за № 22-3 Буднікава І., выд. Талочынскай прызыўн. камісіяй, кв. 481п.

— Пэнсіён. кніжка за № 4130 Данілава П., выд. Аршанск. вучастковай стракасай, кв. 481п.

— Квіт за № 52274 Пятровіча П. Г., выд. Крупскім страхагенцтвам аб страхаваньні каровы, кв. 481п.

— Пасьвечаньне аб сканчэньні Бабруйскай сямігодкі Гайковіча І. Ф., кв 481п.

— Паявая кніжка Міркіна А., выд. Крупскім спаж. т-вам, кв. № 481п.

— Вучотна-конская кніжка Сакалоўскай А. Д., кв. 481п.

— Асабовая кніжка за № 120 Борбата А. К., выд. Крупскім РВК, кв. 481п.

— Вучотна-конская кніжк № 83 Борбата А. К., кв. 481п.

— Вучотна-конская кніжка Борбата М. Н., кв. 481п.

— Вучотна-конская кніжка Макарэвіча П. М., кв. 481п.

— Вучотна-конская кніжка Шарко А. В., кв., 481п.

— Вучотна-конская кніжка Кушнер Н. П., кв. 481п.

— Вучотна-конская кніжка Маласая Ф. Т., кв. 481п.

— Вучотна-конская кніжка Коськіна С. І., кв. 481п.

— Вучотна-конская кніжка Дарафеева М. А., кв. 481п.

— Вучотна-конская кніжка Цыцерскага Р. Ф., кв. 481п.

— Асабовая кніжка Сейка П. Г., выд. быўш. Бобарскім ВВК, кв. 481п.

— Вучотна-конская кніжка Сойка П. Г., кв. 581п.

— Вучотна-конская кніжка Камарова М. Н., кв. 481п.

— Вучотна-конская кніжка Берысава Г. І., кв. 481п.

— Вучотна-конская кніжка Гайковіча Б. Ф., кв. № 481п.

— Вучотна-конская кніжка Ефімава А. Р., кв. № 481п.

— Вучотна-конская кніжка Лабанава Г. В., кв. 481п.

— Вучотна-конская кніжка Хватчэўскага К. А., кв. № 481п.

— Вучотна-конская кніжка Кашэлева Ф. І., кв. 481п.

— Вучотна-конская кніжка Алісіевіча В. Л., кв. 481п.

— Вучотна-конская кніжка Пручкоўскага С. М., кв. 481п.

— Вучотна-конская кніжка Моніч Л. Л.,

— Вучотна-конская кніжка Казлова Ф. І., кв. 481п.

— Сяброўская кніжка № 244 Сузько Н., выд. Мазырск. саюзам камунальнікаў, кв. 471п.

— Сяброўская кніжка № 1575 Бакуна Я. А., выд. Барысаўск. прыгарож. т-вам, кв. 474п.

— Асабовая кніжка Трыкіша М. гр-на жых. у в. Буда Нараўлянск. р-ну, кв. 475 п.

— Сяброўскі білет № 401 Штукар Ф., выд. Мазырск. саюзам харчавікоў, кв. 476 п.

— Асабовае пасьведчаньне, спраўка аб сацыяльн. становішчы Казлоўскага Ф.Е. і аблігац. 5 р. на імя Карэнца О., кв. 477-п.

— Сяброўскі білет № 58458 Лаўрука І. Д., выд. Мазырск. АК ЛКСМБ, кв. 478 п.

— Вучотна-конская кніжка Хонькіна Н. гр-на жых у с. Старае, Мсьціслаўск. р-ну, кв. 479 п.

— Сяброўскі білет № 702 Казімірчук Т. Х., выд. саюзам саўгандльслуж., кв. 480 п.

— Картка на каня Тарасіка Д., выд. Чэрвенскім РВК, кв. 813.

— Картка на каня Няборскага І. Д., выд. Чэрвенскім РВК, кв. 813.

БАЛЯНС ШКЛОЎСКАГА РАЙКАМБІНАТУ

на 1-е кастрычніка 1928 году.

АКТЫЎ.

	Сума прыватная	Сума агульная
I. Маёмасьць		
1) Будынкі і пабудовы	71989—85	
2) Абсталяваньне і машыны	75173—96	
3) Струмэнты	1089—27	
4) Гаспадарчы інвэнтар	1192—37	
5) Транспартны	891—17	
6) Няскончаныя пабудовы	1162—54	151499—16
II. Матар'